Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

16 ЧЭРВЕНЯ 2018 г. СУБОТА № 114 (28730)

ВЫСАКАРОДНЫ ШЛЯХ

Работнікам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь

Паважаныя таварышы!

Сардэчна віншую вас з Днём медыцынскіх работнікаў.

Вы знайшлі прызванне ў адной з самых важных, адказных і паважаных прафесій, выбраўшы высакародны шлях — дапамагаць людзям, штодзень змагацца за здароўе і жыцці пацыентаў, праяўляць цярплівасць і міласэрнасць у адносінах да кожнага.

На клопат аб чалавеку нацэлена і сістэма аховы здароўя Беларусі. Даступнасць і якасць паслуг, выкарыстанне ў дыягностыцы і лячэнні найноўшых тэхналогій гарантаваны ўсім грамадзянам нашай краіны.

Многія дасягненні айчыннай медыцыны атрымалі міжнароднае прызнанне. Назапашаны вопыт, высокае майстэрства і адданасць справе спецыялістаў галіны зрабілі беларускія клінікі і цэнтры прывабнымі для замежных гасцей.

Дзякую за працу ўрачам і вучоным, правізарам і фармацэўтам, фельчарам, медыцынскім сёстрам і прадстаўнікам малодшага медыцынскага персаналу — усім, хто застаецца верным абавязку, шчыра служыць людзям і дзяржаве.

Жадаю вам моцнага здароўя, шчасця, поспехаў у працы!

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

КАРАТКА

● Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правядзе 19 чэрвеня перагаворы з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным, які наведае Беларусь з афіцыйным візітам. Затым Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін прымуць удзел у пасяджэнні Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы.

● **Беларусь у студзені — красавіку 2018 года павялічыла экспарт тавараў і паслуг у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года на 24,4 % да $13,1 млрд.**

● Хатнім кандытарам і кулінарам у Беларусі дазволілі прадаваць сваю прадукцыю на рынках згодна з пастановай Савета Міністраў ад 14 чэрвеня 2018 года № 452.

● **Больш за 180 беспрацоўных у Гомельскай вобласці, якія стаяць на біржы працы, атрымалі субсідыі на адкрыццё сваёй справы ў студзені — маі на суму больш BYN425 тыс.**

● У Расонскім раёне згарэў трактар, за рулём якога быў п'яны кіроўца.

ISSN 1990 - 763X

ГАРАДЗІШЧАНСКІ «АГЕНТ 103»

На Баранавіцкай станцыі хуткай неадкладнай медыцынскай дапамогі працуе сямнаццаць брыгад. Дзве з іх — у сельскай мясцовасці. Сярод фельдчараў паста гарпасёлка Гарадзішча нясе сваю пачэсную службу і Віктар ТУРКЕВІЧ. Сёлета Віктар Уладзіміравіч адзначае юбілей — 40 гадоў працы ў хуткай дапамозе. Ён ужо на пенсіі, але ўсё роўна не пакідае сваю любімую, хоць і цяжкую працу.

— Нам даводзіцца дабірацца ў самыя аддаленыя вёскі гарадзішчанскай зоны ў любое надвор'е, у любы час сутак. Галоўнае — паспець і выратаваць хворага, — кажа Віктар Уладзіміравіч пра сваю брыгаду, пра сваю службу. — Кожны раз стараемся апраўдваць сваё прызначэнне — быць хуткай дапамогай.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

НА ЛЮБЫ ГУСТ І КАШАЛЁК

Сотні тысяч юных беларусаў атрымаюць пуцёўкі на аздараўленне

Калі спытаць нас, дарослых, то самыя яркія ўспаміны дзяцінства ў многіх — гэта паездкі ў дзіцячы лагер на летніх канікулах. Яны часта былі поўныя такога захаплення і прыгод, што адразу пасля заканчэння змены многія дзеці ўжо пачыналі марыць аб надыходзе наступнага лета...

СТАР. 4

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

■ Прагрэс — вучэбнаму працэсу

НЕ ПРОСТА МОДА

Калі сістэма адукацыі «захрасне» ва ўчарашнім дні, лічбавае грамадства нам не свеціць...

Для таго каб зразумець, наколькі складана даецца «шкалярам» тая ці іншая тэма ў вучэбнай праграме або як успрымаецца вучэбны матэрыял, выкладзены ў падручніку, можна правесці, напрыклад, міністэрскую кантрольную работу, ці арганізаваць маніторынгавае даследаванне, або зрабіць кантрольны зрэз на прыкладзе пэўнага рэгіёна... А можна задзейнічаць для гэтага... інтэлектуальныя сістэмы. Пра тое, якія магчымасці адкрываюцца перад адукацыяй у эпоху IT, і што трэба рабіць, каб не адстаць ад часу, разважалі ўдзельнікі навукова-практычнай канферэнцыі «Лічбавая трансфармацыя адукацыі».

Адзіны ўваход

Як вядома, напрыканцы года кіраўніком дзяржавы быў падпісаны Дэкрэт № 8 «Аб развіцці лічбавай эканомікі». Але будаўніцтва лічбавага грамадства будзе немагчымае, калі сістэма адукацыі «захрасне» ва ўчарашнім дні...

СТАР. 6

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

НЯСУМНАЕ ЛЕТА З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

Вы гарантуеце сабе і сваім блізкім, аформіўшы падпіску на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

■ Парламенцкі дзённік

У ПРАЦЭСЕ РАЗВІЦЦЯ

Якія законы патрабуюць абнаўлення

Змяненні і дапаўненні ў Лясны і Банкаўскі кодэксы, закон аб СМІ і некаторыя іншыя законы разгледзелі дэпутаты на чарговым пасяджэнні сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі. Парламентарыі пракаментавалі, якія абнаўленні прапаноўваліся на разгляд.

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Валянціна РАЖАНЕЦ расказала, як ідзе абмеркаванне змяненняў у закон «Аб сродках масавай інфармацыі». «З моманту прыняцця закона ў першым чытанні прайшло амаль два месяцы. Увесь гэты перыяд пастаянная камісія інтэнсіўна рыхтавала праект закона да другога чытання. Адбылося сем пасяджэнняў камісіі, у тым ліку пашыранае з удзелам журналісцкай супольнасці», — адзначыла Валянціна Ражанец. Частка прапаноў была ўлічана. Напрыклад, Белтэлерадыёкампанія прапанавала паменшыць тэрмін захоўвання матэрыялаў з дванаццаці месяцаў да шасці. Таксама прадугледжаны парадак абскарджання рашэнняў Міністэрства інфармацыі аб абмежаванні доступу да інтэрнэт-рэсурсаў, сеткавых выданняў і аб адмове ў аднаўленні доступу да гэтых выданняў. Акрамя таго, падтрымана прапанова па больш мяккім пераходзе да напаўнення вяшчання тэлевізійных СМІ беларускім кантэнтам. Будзе ўлічвацца не штотыднёвы, а штомесячны перыяд. Таксама не менш за 15 % аб'ёму неабходна будзе забяспечыць па выніках шасці месяцаў, а не менш за 30 % — па выніках двух гадоў са дня ўступлення закона ў сілу.

Член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па бюджэце і фінансах Таццяна САЙГАНАВА дакладвала пра змяненні і дапаўненні ў Банкаўскі кодэкс. Парламентарый расказала: «Па-першае, у кодэксе замацоўваецца палажэнне пра тое, што ў банка не можа быць менш за два заснавальнікі. Пералік банкаўскіх аперацый, відаў дзейнасці нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацый будзе ўстанаўліваць Нацыянальны банк Беларусі, што дазволіць больш гібка рэгуляваць іх дзейнасць». Акрамя таго, шэраг змяненняў датычыцца перапынення дзейнасці банкаў. У прыватнасці, змяняецца парадак ліквідацыі банка, калі ўстанова сама яе ініцыявала. Да таго ж уносяцца дапаўненні, звязаныя з пашырэннем безнаяўных разлікаў. Змяненні былі прапанаваныя ў тым ліку ў сувязі з неабходнасцю стварэння добрага інвестыцыйнага клімату. Што датычыцца спажыўца, здымаюцца абмежаванні ў выбары страхавой арганізацыі пры заключэнні дагавора. Да таго ж можна адмовіцца ад платных паслуг, і ў гэтым выпадку банк мае права прапанаваць іншы дагавор. Зараз гэта не замацавана заканадаўча. Больш раскрываюцца сітуацыі, у якіх апісваецца, што складае банкаўскую тайну.

Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы Таццяна КАНАНЧУК расказала, чаго чакаць ад закона «Аб асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях». Увага, па словах парламентарыя, будзе ўдзелена рэжымам аховы такіх тэрыторый. Прадугледжваецца пералік абмежаванняў і забарон, якія на іх распаўсюджваюцца. Пры гэтым даецца права дзяржаўным органам, якія прымаюць рашэнні пра заснаванне асабліва ахоўных прыродных тэрыторый, устанаўліваць дадатковыя абмежаванні ці забароны на пэўныя віды гаспадарчай ці іншай дзейнасці.

Асаблівая роля адводзіцца планам кіравання такімі тэрыторыямі. Яны ўжо будуць абавязковымі. Гэта звязана з тым, што, з аднаго боку, неабходны больш актыўныя меры па захаванні асабліва ахоўных прыродных тэрыторый. З другога боку, на думку старшыні камісіі, сёння кожная тэрыторыя — нацыянальны парк, заказнік, помнік прыроды, запаведнік — могуць і павінны з'яўляцца крыніцамі сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў. Перш за ўсё гаворка ідзе пра развіццё экалагічнага турызму. Так, ёсць выпадкі, калі некантраляваны турызм наносіць шкоду прыродным комплексам і аб'ектам. Аднак рэкрэацыйны патэнцыял сёння яшчэ недастаткова задзейнічаны ў нашай краіне. Планы кіравання гэтымі тэрыторыямі дазволяць вызначыць прыярытэты як аховы, так і ўстойлівага развіцця.

Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы Наталля КЛІМОВІЧ растлумачыла, якія змены датычацца Лясного кодэкса. Сярод іх — пашырэнне паняцця лесагаспадарчай дзейнасці. Зараз, напрыклад, догляд лесагаспадарчых лясных дарог, рассяканне, расчыстка з мэтай стварэння ці пашырэння лесанасенных плантацый — усё гэта не ўваходзіць у разрад лесагаспадарчых мерапрыемстваў. Існуе такая пэўная калізія. Да таго ж пашыраецца паняцце іншых высечак.

Калі гаварыць пра спажыўца, раней грамадзяне мелі магчымасць нарыхтоўваць драўніну толькі на ўчастках ляснога фонду, якія былі запраектаваныя для такіх работ. Што стварала пэўныя нязручнасці. Напрыклад, чалавек пражывае побач з лясным масівам, дзе паваліла дрэвы з-за ўрагану. Ён не мог нарыхтаваць з іх дровы. Цяпер прапануецца даць магчымасць юрыдычным асобам, якія вядуць лясную гаспадарку, уносіць змяненні і дазваляць праводзіць такія высечкі. Апошні час развіваецца рамесная дзейнасць з выкарыстоўваннем галін дрэў і ляшчыны. Паводле дзейнага кодэкса, такая нарыхтоўка адносілася да незаконнай высечкі. У законапраекце прапануецца аднесці яе да пабочнага віду лесакарыстання, што не будзе з'яўляцца нейкім парушэннем.

Надзея АНІСОВІЧ

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

ТРАМП АДВАЖЫЎСЯ НА ГАНДЛЁВУЮ ВАЙНУ З КІТАЕМ

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп абвясціў аб увядзенні пошлін на імпарт тавараў з Кітая на суму $50 млрд. Пра гэта гаворыцца ў распаўсюджанай Белым домам заяве, паведамляе ABC News. Агенцтва Reuters са спасылкай на офіс гандлёвага прадстаўніка ЗША паведамляе, што амерыканскія мытнікі пачнуць збіраць дадатковыя пошліны ўжо з 6 ліпеня. Як гаворыцца ў апублікаванай заяве Мінкамерцыі КНР, кітайскі бок мае намер даць «моцны адпор» у адказ на такія дзеянні.

МАКРОН ХОЧА ЗРАБІЦЬ ФРАНЦУЗСКУЮ ГАЛОЎНАЙ МОВАЙ ЕЎРАСАЮЗА

Прэзідэнт Францыі Эмануэль Макрон хоча вярнуць французскай статус афіцыйнай мовы еўрапейскіх грамадскіх і палітычных інстытутаў, які яна мела да ўступлення Вялікабрытаніі ў Еўрапейскую эканамічную супольнасць у 1973 годзе. Такое змяненне можа стаць магчымым пасля выхаду каралеўства са складу Еўрасаюза (Брэксіту), паведаміла газета The Wall Street Journal. Як нагадвае выданне, цяпер англійская мова з'яўляецца афіцыйнай для 12,8 % жыхароў Еўрасаюза, аднак пасля Брэксіту яна застанецца другой афіцыйнай мовай толькі для дзвюх краін — Ірландыі і Мальты, дзе пражывае 1,2 % насельніцтва ЕС. Пазіцыю Макрона падтрымлівае старшыня Еўракамісіі Жан-Клод Юнкер.

ПАД ЛОС-АНДЖЭЛЕСАМ ПАБУДАВАНЫ ТРАНСПАРТНЫ ТУНЭЛЬ

Кампанія The Boring Company практычна завяршыла пракладку і будаўніцтва ўчастка падземнага тунэля пад Лос-Анджэлесам, прызначанага для транспарціроўкі людзей у якасці альтэрнатывы наземнаму транспарту і метро. Працягласць участка перавышае 4,3 кіламетра, паведаміў кіраўнік кампаніі Ілан Маск у сваім «Інстаграме». «Праз некалькі месяцаў мы зможам прапанаваць пасажырам бясплатныя паездкі», — напісаў ён. Пры гэтым пасля завяршэння льготнага перыяду кошт праезду дадзенай сістэмы будзе ніжэйшы за кошт аўтобуснага білета.

НА ЖЫХАРОЎ ГАВАЯЎ ПАСЫПАЎСЯ ДОЖДЖ З КАШТОЎНЫХ КАМЯНЁЎ

У выніку вывяржэння вулкана Кілаўэа на Вялікім востраве Гаваяў, якое доўжыцца ўжо больш за месяц, лавай выштурхнула мінеральныя камяні зялёнага колеру — алівіны, падобныя на ізумруды. Аб гэтым піша газета Daily Mail. Гэтыя невялікія камяні залягаюць у вулканічных пародах. Адзначаецца, што жыхары падбіраюць камяні, якія з'явіліся на вуліцах і пляжах пасля вывяржэння, і выкладваюць фатаграфіі. Дарэчы, адна з разнавіднасцяў алівіна — перыдот — з'яўляецца каштоўным каменем. Яго кошт можа дасягаць $450 за карат.

■ Віншуем!

ДЗЕЛЯ НАШАГА ЗДАРОЎЯ

Заўтра медыкі адзначаць прафесійнае свята

З якім настроем сустракае гэты дзень айчынная медыцына, расказалі спецыялісты Міністэрства аховы здароўя.

— Штогод паступаць у медыцынскія ВНУ прыходзяць выпускнікі з самымі высокімі баламі, — адзначыла **начальнік галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі і экспертызы Міністэрства аховы здароўя Алена БОГДАН.** — Мы ганарымся, што высокаадукаваныя маладыя людзі становяцца нашымі студэнтамі.

Штогод мы мяняем сістэму падрыхтоўкі кадраў у адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі. У прыватнасці, з новага вучэбнага года на 1-м курсе студэнты пачнуць вывучаць «Асновы догляду пацыента», на 6-м курсе будзе ўведзена дысцыпліна «Медыцынскае права з пытаннямі біяэтыкі і камунікацый паміж урачом і пацыентам».

Мяняецца і структура аказання медыцынскай дапамогі на ўзроўні пярвічнага звяна, у прыватнасці, адбываецца пераход ад тэрапеўтаў да ўрачоў агульнай практыкі. Летась у Беларусі ўрачамі агульнай практыкі працавалі ўжо 1174 спецыялісты, а гэта 40 %. Мяркуецца, што сёлета гэта лічба дасягне 60% (або 2 тысячы ўрачоў агульнай практыкі). Тэрапеўты праходзяць перападрыхтоўку, пасля чаго могуць спалучаць функцыі эндакрынолага, оталарынголага, афтальмолага, пульманолага і кардыёлага. Разам з гэтым працоўныя месцы ўрачоў агульнай практыкі аснашчаюць неабходным дыягнастычным абсталяваннем — глюкометрамі (для вымярэння ўзроўню глюкозы ў крыві), афтальмаскопамі (для агляду вочнага дна), прыборамі для агляду лор-органаў, кардыёграфамі (для вымярэння біяэлектрычнай актыўнасці сэрца). Холтэраўскім манітараваннем (прыбор, які фіксуе работу сэрца на працягу сутак) працоўныя месцы будуць абсталяваны з разліку адна сістэма на пяць урачоў.

Для ранняга выяўлення хвароб, у тым ліку і анкалагічных, у нашай краіне ўсё больш распаўсюджваюцца скрынінгавыя праграмы. Для Беларусі гэта актуальна — тут штогод рак выяўляецца ў больш чым 50 тысяч чалавек. Сёння паспяхова ўкараняюцца скрынінгавыя праграмы па выяўленні рака чатырох самых распаўсюджаных лакалізацый: шыйкі маткі, малочных залоз, прастаты і кішэчніка. У найбліжэйшых планах, як паведаміў **дырэктар РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, член Савета Рэспублікі Алег СУКОНКА**, з'явіцца яшчэ чатыры праекты па скрынінгу раку. Гэта дазволіць выяўляць на ранніх стадыях рак лёгкага, ратаглоткі, яечнікаў і скуры. А пілотны праект па скрынінгу раку лёгкага ўжо рэалізуецца на базе Мінскага абласнога туберкулёзнага дыспансера.

Пакуль у структуры смяротнасці першае месца займаюць не анкалагічныя, а сардэчна-сасудзістыя хваробы. Яны становяцца прычынай гібелі да 58 % людзей, адзначыў **галоўны пазаштатны кардыёлаг Міністэрства аховы здароўя, дырэктар РНПЦ «Кардыялогія» Аляксандр МРОЧАК**. Тым часам імкліва развіваюцца тэхналогіі ў аказанні кардыялагічнай дапамогі.

— Мы можам выратоўваць людзей ад інфаркту міякарда, з вострым каранарным сіндромам, кардыяміпатыяй — натуральным вынікам гэтага стане павелічэнне працягласці жыцця і колькасці пацыентаў з сардэчнай недастатковасцю. Фінальная стадыя аказання дапамогі такім пацыентам — трансплантацыя. У Беларусі ўжо праведзена 293 перасадкі сэрца, выканана ўнікальная аперацыя па трансплантацыі «сэрца+лёгкія», — расказаў Аляксандр Мрочак.

Летась стартавалі сістэмныя праграмы па элімінацыі (выключэнні) такіх хвароб, як ВІЧ, туберкулёз і гепатыт С, распачата лячэнне рассеянага склерозу. У прыватнасці, пачата лячэнне віруснага гепатыту С за сродкі рэспубліканскага бюджэту. Беларусь, дарэчы, стала першай краінай свету, дзе гэта магчыма за дзяржаўныя сродкі. У праграму пакуль уключана 2 тысячы пацыентаў. Калі раней прэпараты на лячэнне гэтай хваробы закупляліся за сродкі Глабальнага фонду, то зараз асноўныя лекі выпускаюцца айчыннымі фармакалагічнымі прадпрыемствамі. Дзякуючы гэтаму курс лячэння аднаго пацыента стаў таннейшы ў 40 разоў. Калі 7-8 гадоў таму яно каштавала 30-40 тысяч долараў, то зараз — 800—900 долараў. Лячэнне гепатыту С у 96 % выпадкаў паспяховае і вядзе да поўнага знікнення хваробы, у пацыента не развіваецца цыроз і рак печані.

Усяго ў Беларусі каля 34 тысяч хворых на вірусны гепатыт С. Акрамя 2 тысяч ужо ўключаных у праграму сфарміравана заяўка на лячэнне яшчэ 4 тысяч. Такім чынам, штогод такіх пацыентаў будуць накіроўваць на лячэнне, і адпаведна іх колькасць паступова зменшыцца, расказаў **каардынатар праграм Сусветнай арганізацыі аховы здароўя па інфекцыйных хваробах у Рэспубліцы Беларусь Вячаслаў ГРАНЬКОЎ**.

Каля 70 % ВІЧ-станоўчых беларусаў атрымліваюць лячэнне за дзяржаўны кошт. Беларусь, дарэчы, адна з першых краін свету, дзе ўкаранілі саматэставанне на ВІЧ. З мая гэтага года такой методыкай ахоплены ўсе рэгіёны. Тэст на ВІЧ можна набыць у звычайнай аптэцы і зрабіць яго дома. Ужо каля двух дзясяткаў чалавек пасля такой працэдуры звярнулася ў медыцынскія ўстановы для пацвярджэння дыягназу.

Поспехі беларускіх фармакалагаў не толькі ў выпуску прэпаратаў для лячэння такіх складаных хвароб як гепатыт С. Сёння на беларускім рынку каля 53 % лекаў — айчыннай вытворчасці. 84 % з іх каштуюць не больш за 10 рублёў, нягледзячы на тое, што гэта высокаінтэлектуальны прадукт, які адпавядае ўсім крытэрыям эфектыўнасці, паведаміла **начальнік упраўлення фармацэўтычнай інспекцыі і арганізацыі лекавага забеспячэння Міністэрства аховы здароўя Людміла РЭУЦКАЯ**. За апошнія 15 гадоў у Беларусі не выяўлена выпадкаў фальсіфікацыі лекавых сродкаў, а з праверaных 5,3 тысячы серый прэпаратаў айчыннай вытворчасці забракаваны ўсяго 0,1 % падчас допуску на рынак. Пры гэтым праверкі ў аптэчных сетках браку не выявілі.

— Мы змагаемся з павышэннем цэн на лекавыя сродкі. У прыватнасці, былі скаргі на тое, што ў Расіі некаторыя прэпараты таннейшыя, чым у Беларусі. Мы працавалі з вытворцамі і пастаўшчыкамі і дамагліся зніжэння цэн, — адзначыла Людміла Рэуцкая.

Алена КРАВЕЦ

■ Жыллё

Чаргавікі з Мінска — у гарады-спадарожнікі

Гатовы праект указа аб аказанні дадатковай дзяржпадтрымкі мінчанам пры будаўніцтве жылля ў Смалявічах

Пра гэта паведаміў начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр ГОРВАЛЬ, перадае БЕЛТА.

«Падрыхтаваны праект указа аб правядзенні эксперымента з Мінскам і Смалявічамі ў частцы таго, каб элементы дзяржаўнай падтрымкі прапанаваць тым чаргавікам з Мінска, якія паедуць у горад-спадарожнік на пастаяннае месца жыхарства, — незалежна ад таго, маюць яны права на дзяржпадтрымку ці не. Гэты механізм зараз прапрацоўваецца. Спрабуем такім чынам прастымуляваць рух чаргавікоў з Мінска ў гарады-спадарожнікі», — сказаў Аляксандр Горваль.

Ён нагадаў, што працягвае дзейнічаць Дзяржаўная праграма па будаўніцтве жылых раёнаў для жыхароў сталіцы ў гарадах-спадарожніках. «Яна не так актыўна рэалізуецца з-за фінансавага аспекту, паколькі будаўніцтва жылля ў горадзе-спадарожніку атрымліваецца даражэйшае, чым у базавым горадзе. Калі на абжытых тэрыторыях кошт інфраструктуры складае 20—30 % ад цаны аб'екта, то ў гарадах-спадарожніках — 50—60 %. Трэба час, каб збалансаваць усе пытанні з фінансавага і сацыяльнага пункту гледжання», — адзначыў начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі.

Ідэю дапамагаць субсідыямі і льготнымі крэдытамі чаргавікам, якія пагодзяцца будавацца ў Смалявічах, агучвала кіраўніцтва будаўнічай галіны яшчэ летась. Меркавалася, што будзе усё роўна, у якім годзе сям'я пастаўлена ў чаргу, — важна, каб яна хацела змяніць месца жыхарства — ужо за адно жаданне ёй абяцаюць дзяржпадтрымку.

Сяргей КУРКАЧ

■

■ Фінансы

Якія паводзіны ў замежнай валюты, а менавіта ў долара

У мінулы аўторак сталі вядомыя вынікі пасяджэння Федэральнай рэзервовай сістэмы ЗША. Як і меркавалі эксперты, працэнтную стаўку павысілі на 0,25 % да 2,00 %. Пасля чаго прагучаў прагноз па далейшай манетарнай палітыцы. Долар, аднак, зніжаецца на пазабіржавым рынку Форэкс, нягледзячы на аптымізм рэгулятара. Што пайшло не так?

Каментарый дае фінансавы кансультант Міхаіл ГРАЧОЎ:

— Сапраўды, камітэт па адкрытых рынках Федэральнай рэзервовай сістэмы ЗША па выніках двухдзённага пасяджэння прыняў рашэнне аб чарговым павышэнні працэнтнай стаўкі. Магчымасць такога развіцця падзей ацэньвалася як вышэйшая за 90 %, што, уласна, і здарылася. Крыху пазней з каментарыем па рашэнні рэгулятара выступіў старшыня ФРС Джэром Паўэл. Яго выступленне рынкі расцанілі негатыўна, што прывяло да паслаблення долара.

Джэром Паўэл пацвердзіў, што рэзервовая сістэма гатовая ў бягучым годзе правесці яшчэ два цыклы павышэння стаўкі, пры гэтым ён адзначыў, што паказчык інфляцыі далёкі ад мэтавага значэння. Сёння індэкс долара зніжаецца.

На беларускім валютным рынку долар таксама знаходзіцца ў мінусе (-0,53 %), што адлюстроўвае агульную тэндэнцыю. Акрамя таго, днямі адбудзецца пасяджэнне яшчэ аднаго буйнога ўдзельніка сусветнага фінансавага рынку — Еўрапейскага цэнтральнага банка, ад якога таксама чакаюць важных рашэнняў.

Сяргей КУРКАЧ

■

УРУГВАЙ ДАЦІСНУЎ ЕГІПЕТ

Другі матч чэмпіянату свету таксама выявіў пераможцу: з лікам 1:0 зборная Уругвая ўсё ж адолела каманду Егіпта. У самым канцы матча гол забіў абаронца Хасэ Хіменэс. Забіўны нападаючы егіпцян

Махамед Салах *(на фота)*, зорка гэтага сезона, не трапіў у заяўку сваёй каманды, таму што залечвае траўму, атрыманую ў фінале Лігі чэмпіёнаў.

КАБАН ПРАДКАЗАЎ ПАЎФІНАЛІСТАЎ

Кабан-экстрасэнс па мянушцы Містычны Маркус, які раней ніколі не памыляўся ў «прагнозах», прадказаў удзельнікаў паўфіналаў. Для гэтага перад ім расклалі яблыкі са сцяжкамі краін-удзельніц. Кабан з'еў чатыры: са сцягамі Бельгіі, Аргенціны, Нігерыі і Уругвая. Паводле слоў гаспадыні жывёлы Джульеты Стывенс, раней ён аналагічным чынам паспяхова вызначыў пераможцаў чэмпіянату свету — 2014, Уімблдона, а таксама Брэксіт і перамогу Дональда Трампа на выбарах.

Адным з самых вядомых жывотных-прадказальнікаў быў васьміног Паўль, які паспяхова адгадваў вынікі матчаў зборнай Германіі. З 14 яго «прадказанняў» няправільнымі аказаліся толькі два.

РАСІЯ — КРАІНА МЯДЗВЕДЗЯЎ

Так лічаць многія замежнікі, і яны ў гэтым пераканаліся на свае вочы: у гонар перамогі зборнай Расіі на аўтамабілі з дудкай у зубах па Маскве праехаўся самы сапраўдны касалапы, відэа ў сеціве размяшчалі відавочцы. Балельшчыкі мядзведзя не спалохаліся і тут жа падбеглі яго фатаграфаваць. Драпежнік, седзячы на заднім сядзенні адкрытага аўтамабіля, захоплена дзьмуў у футбольную дудку, пакуль яе не адабралі. Мяркуючы па прыязнасці касалапага, ён дрэсіраваны.

БРАЗІЛЬЦАЎ СТЫМУЛЮЮЦЬ МІЛЬЁНАМ

Гульцы зборнай Бразіліі па футболе атрымаюць па мільёне долараў прызавых у выпадку перамогі на чэмпіянаце свету ў Расіі. Столькі ж дастанецца галоўнаму трэнеру Цітэ і яго памочнікам, астатнія члены дэлегацыі заробяць менш.

Іван КУПАРВАС.

ТАДЭВУШУ КАСЦЮШКУ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА

Сёння ў Вілейцы ў былым памяшканні мясцовай друкарні па вуліцы Вадап'янава, 35 адкрыецца музейная экспазіцыя, якая прысвечана Тадэвушу Касцюшку.

Знакавае імя ў гісторыі Беларусі і суседніх краін, у гісторыі ЗША асэнсоўваецца найперш праз матэрыялы калекцыі лаўрэата прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» Уладзіміра Ліхадзедава. Вядомы ў краіне і за яе межамі філакартыст сабраў багатую калекцыю старых паштовак, праз якія і раскрывае вобраз знакамітага суайчынніка. Дарэчы, Уладзімір Ліхадзедаў прысвяціў Тадэвушу Касцюшку адну са сваіх кніг, выдадзеную ў аўтарскай серыі «У пошуках страчанага».

Новая экспазіцыя складаецца з двух раздзелаў. Першы — «Жыццёвы шлях і ўшанаванне памяці Тадэвуша Касцюшкі». У ім — старыя паштоўкі, друкаваныя матэрыялы і іншыя артэфакты з сярэдзіны XIX — пачатку XX стагоддзя. Другі раздзел — спроба ўзнавіць інтэр'ер пакоя военачальніка, у якім ён жыў у час знаходжання ў ЗША, у Філадэльфіі.

Акрамя таго, у прыватным музеі, які сёння нагадвае дзейную майстэрню, прадстаўлена выстаўка друкарскага абсталявання XVI—XX стагоддзяў. Ахвотныя змогуць уласнаручна вырабіць ліст паперы па старадаўняй тэхналогіі. А пасля надрукаваць на ім першы ліст Біблііі Францыска Скарыны.

Сяргей ШЫЧКО.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

ДВА ПА ДВА

Дзве пары двайнят з'явіліся на свет у Аршанскім гарадскім радзільным доме.

Фота БелТА.

У сям'і Надзеі і Аляксандра Кібісаў 12 чэрвеня нарадзілася дзяўчынка вагой 2700 грамаў, ростам 49 сантыметраў і хлопчык вагой 3020 грамаў, ростам 51 сантыметр. А ў сям'і Святланы і Івана Вярэм'евых нарадзіўся хлопчык вагой 3290 грамаў, ростам 52 сантыметры і дзяўчынка вагой 3120 грамаў, ростам 50 сантыметраў.

БелТА.

ПРА ЎТРЫМАНЦАЎ МОЖНА БУДЗЕ ПАВЕДАМІЦЬ АНЛАЙН

З 1 верасня ўводзіцца новая паслуга — перадача даных для фарміравання базы працаздольных грамадзян, не занятых у эканоміцы. Яна будзе даступная на Адзіным партале электронных паслуг.

Скарыстацца ёй змогуць дзяржаўныя органы і іншыя арганізацыі. Для гэтага трэба зарэгістравацца на партале, атрымаць сертыфікат адкрытага ключа і заключыць дагавор. Паслуга бясплатная. Нагадаем, што база даных не занятых у эканоміцы працаздольных грамадзян будзе сфарміравана да 1 снежня. Яна ўключыць такую інфармацыю пра чалавека, як яго прозвішча, імя і імя па бацьку, пол, грамадзянства, ідэнтыфікацыйны нумар, від, серыя і нумар пашпарта, рэгістрацыя па месцы жыхарства.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

МУЖЧЫН «ЗВАЛІЛА» БРАДЖЭННЕ

У Дрыбінскім раёне работнікі МНС выратавалі двух чалавек са склепа.

Паведамленне ад дыспетчара хуткай дапамогі пра знаходжанне ў склепе прыватнага дома ў вёсцы Праабражэнск двух чалавек паступіла ратавальнікам апоўначы.

Высветлілася, што на глыбіні тры метры без прытомнасці ляжалі сыны гаспадара дома. Мужчыны прыехалі на выхадныя да бацькоў. Ратавальнікі пры дапамозе пажарнага рукава дасталі пацярпелых са склепа і перадалі брыгадзе хуткай медыцынскай дапамогі. Пасля агляду яны былі шпіталізаваныя ў бальніцу з папярэднім дыягназам «атручэнне неўстаноўленым рэчывам» у стане сярэдняй ступені цяжкасці.

Адна з версій здарэння, як паведамілі ў Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях, — уцечка прадуктаў браджэння ў склепе з няшчыльна закрытых бочак.

Сяргей РАСОЛЬКА.

САЛОДКІ МАРАДОНА

Як вядома, аргенцінскі футбаліст Дыега Марадона ў маі падпісаў трохгадовы кантракт з брэсцкім клубам «Дынама» і заступіў на пасаду старшыні праўлення. Адкрытае акцыянернае таварыства «Берасцейскі пекар» адрэагавала на падзею надзвычай аператыўна: кандытары вырабілі пернікі з выявай Марадоны. На прадпрыемстве паведамілі, што смачная прадукцыя спечана па заказе футбольнага клуба «Дынама-Брэст». Пакуль выпушчана пробная партыя прысмакаў колькасцю 150 штук. Яны ёсць у продажы ў фан-краме клуба па два рублі за адзін пернік.

Фота БелТА.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

АТРУТНЫЯ ПАРЫ НА БАЛКОНЕ

У Барысаўскім раёне ратавальнікі правялі дэмеркурызацыю ў жылым доме.

Увечары ім паступіла паведамленне аб выяўленні ёмістасці са змесцівам, падобным на ртуць, на балконе жылога дома на вуліцы Маладзёжнай у вёсцы Лошніца.

На месцы супрацоўнікі МНС сапраўды засведчылі разліцё каля 20 грамаў вадкага металу. Усяго ў шкляной ёмістасці аб'ёмам 0,5 літра знаходзілася каля 100 грамаў рэчыва. Па словах гаспадыні кватэры, ртуць прынёс яе сужыцель.

Замеры паветра паказалі, што канцэнтрацыя пары ртуці на балконе і ў сумежным пакоі перавышае норму ў 100 разоў, а на кухні — у 45 разоў, паведамілі ў Мінскім абласным упраўленні МНС. Ратавальнікі правялі дэмеркурызацыю, апрацавалі памяшканні содавым растворам і пакінулі для праветрывання. Было сабрана 0,015 кілаграма ртуцьзмяшчальных адходаў. Да заканчэння ліквідацыі надзвычайнай сітуацыі жанчына, яе дачка і сужыцель будуць часова пражываць у родных у тым жа населеным пункце. Пацярпелых няма. Эвакуацыя іншых жыльцоў не праводзілася.

Сяргей РАСОЛЬКА.

НА ЛЮБЫ ГУСТ І КАШАЛЁК

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сёлета першыя дзіцячыя лагеры пачалі сваю работу ўжо ў канцы мая. Усяго ж каля 5900 дзіцячых аздараўленчых лагераў у Беларусі возьмуць на аздараўленне дзяцей у 2018 годзе. З іх 1600 лагераў з кругласутачным знаходжаннем дзяцей (у тым ліку 146 стацыянарных) і 4300 лагераў — з дзённым. Пра гэта «Звяздзе» паведаміў **намеснік начальніка аддзела дзяржаўных закупак і метадычнай работы Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Аляксей ЖАЛЯНКОЎ.**

Паводле папярэдняй ацэнкі, у аздараўленчых лагерах усіх тыпаў гэтым летам пройдуць аздараўленне больш за 377 тысяч дзяцей, у тым ліку 219 тысяч дзяцей — у лагерах дзённага знаходжання і 158 тысяч — у лагерах з кругласутачным знаходжаннем. Аздараўленне таксама пройдуць 14 тысяч дзяцей-сірот і больш за 4 тысячы дзяцей-інвалідаў.

Мяркуемы сярэдні кошт пуцёўкі ў аздараўленчы лагер з кругласутачным знаходжаннем на 18 дзён складзе 430 рублёў. Пры гэтым дзяржаўная датацыя будзе раўняцца 185 рублям, што складзе каля 43 % ад поўнага кошту пуцёўкі. Пуцёўка ў лагер з дзённым знаходжаннем будзе каштаваць 93 рублі (датацыя на пуцёўку складзе 76 рублёў, або 82 % ад яе поўнага кошту). Мяркуецца, што частку выдаткаў на набыццё пуцёвак складуць сродкі прадпрыемстваў, прафсаюзных арганізацый, а таксама мясцовых бюджэтаў.

Усяго на правядзенне дзіцячай летняй аздараўленчай кампаніі 2018 года са сродкаў рэспубліканскага бюджэту плануецца накіраваць 43 млн рублёў.

* * *

Акрамя таго, у нашай краіне зараз існуе немалая колькасць прыватных лагераў. Свае паслугі ў арганізацыі дзіцячага адпачынку прапануюць мноства турыстычных кампаній, школы замежных моў, аграсядзібы, дзіцячыя цэнтры і цэнтры дадатковай адукацыі, іншыя адукацыйныя праекты. Вялікай папулярнасцю ў дзяцей і іх бацькоў у летні перыяд карыстаюцца моўныя лагеры, якія арганізоўваюцца як у Беларусі, так і за яе межамі, дзе дзеці могуць не проста ўдасканаліць свае веды па англійскай, французскай, нямецкай, італьянскай і іншых мовах, але і загаварыць на іх. Навінка апошніх гадоў — дзяцей клічуць у так званыя IT-лагеры, дзе акрамя адпачынку абяцаюць займальнае навучанне праграмаванню і тэхналогіям будучыні па спецыяльных інтэнсіўных праграмах. Таксама налічваецца нямала спартыўных, творчых, арт-лагераў — на любы густ, але кошт іх, як правіла, даволі высокі, а дзяржаўныя датацыі на такія лагеры не распаўсюджваюцца.

Як атрымаць пуцёўку ў лагер

Улетку дзіця можа адзін раз з'ездзіць у загарадны лагер, адзін раз пабываць у школьным і яшчэ адзін раз — у профільным лагеры, які арганізоўвае аддзел адукацыі або аддзел культуры і спорту (эка-лагічны, спартыўны і г. д.). У гэтым выпадку яно тры разы атрымае датацыю на адпачынак. Калі ж дзіця хоча паехаць, напрыклад, у загарадны лагер двойчы, то другі раз бацькам давядзецца цалкам аплаціць пуцёўку — пасля першай змены члены камісій адсочваюць усе датацыі на дзяцей. Інфармацыя аб гэтым размешчана на сайце ўпраўлення па адукацыі адміністрацыі Маскоўскага раёна г. Мінска.

Хто можа атрымаць датацыю?

Датацыя (афіцыйна гэтыя грошы называюцца сродкамі дзяржаўнага сацыяльнага страхавання на патанненне кошту пуцёвак) прызначана дзецям усіх работнікаў дзяржаўных і прыватных прадпрыемстваў, за якіх наймальнікі плацяць абавязковыя страхавыя ўнёскі ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва; а таксама дзецям мам, якія знаходзяцца ў дэкрэце; дзецям індывідуальных прадпрымальнікаў, якія плацяць страхавыя ўнёскі; дзецям непрацуючых грамадзян, якія стаяць на ўліку ў цэнтры па працаўладкаванні; дзецям непрацуючых пенсіянераў.

Датацыя пакрывае ў сярэднім 40 % кошту пуцёўкі. Бацькі не атрымліваюць датацыйныя грошы на рукі, яны пералічваюцца адразу на рахунак лагера. А лагер ужо выпісвае бацькам рахунак-фактуру, на падставе якой робіцца аплата. Некаторыя арганізацыі бяруць на сябе аплату ўсёй пуцёўкі, у такім выпадку бацькам неабходна ўнесці толькі вызначаную заканадаўствам даплату не менш за 10 %.

Як атрымаць пуцёўку?

Тут ёсць некалькі варыянтаў.

Варыянт 1. У прадпрыемства ёсць свой лагер.

Тады вам трэба звярнуцца ў камісію па аздараўленні на прадпрыемстве і напісаць заяву, затым аплаціць неабходную частку кошту пуцёўкі.

Варыянт 2. У прадпрыемства няма лагера.

У кожнай арганізацыі, у тым ліку і прыватнай, павінна быць створана камісія па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні, якая займаецца арганізацыяй летняга адпачынку дзяцей. Звычайна камісіямі наладжаны нейкія сувязі, гэта значыць яны традыцыйна купляюць пуцёўкі ў пэўныя лагеры. Але калі ў супрацоўніка ёсць жаданне адправіць дзіця ў іншы лагер, ён можа пазначыць гэта ў заяве, а камісія паспрабуе замовіць пуцёўку ў пажаданае месца адпачынку.

Варыянт 3. У невялікай прыватнай кампаніі няма камісіі па аздараўленні.

У такім выпадку супрацоўнік звяртаецца да кіраўніцтва кампаніі, а яно — непасрэдна да ўласніка лагера. Для замовы пуцёвак неабходна аформіць гарантыйны ліст за подпісам кіраўніка прадпрыемства: «Просім выдзеліць для нашых супрацоўнікаў вось столькі пуцёвак у пэўны аздараўленчы лагер. Аплату гарантуем (з выкарыстаннем сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання на патанненне пуцёўкі)». Уласнік выставіць арганізацыі рахунак-фактуру за мінусам памеру дзяржаўнай датацыі, арганізацыя аплаціць яе па безнаяўным разліку і атрымае па накладной пуцёўкі.

Варыянт 4. У вас няма месца працы.

Калі абое бацькоў — індывідуальныя прадпрымальнікі, рамеснікі, непрацуючыя, пенсіянеры, тады адзін з іх павінен звярнуцца да спецыяліста рэгіянальнага прадстаўніцтва Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні. Там праверацъ ваша права на атрыманне датацыі і выдадуць даведку-пацвярджэнне. Ахвотны падае гэтую даведку ўласніку лагера, і яму прадаюць пуцёўку з выкарыстаннем сродкаў дзяржаўнай датацыі.

Якія дакументы патрэбныя для афармлення дзіцяці ў лагер?

- Заява законнага прадстаўніка непаўналетняга;
- даведка аб стане здароўя (за 3 дні да ад'езду ў лагер);
- копія пасведчання аб нараджэнні;
- пуцёўка;
- даведка з месца працы бацькоў (пра тое, што датацыя са сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання ў летні перыяд не выкарыстана).

ЛЕТА КЛІЧА!

Першая змена ў дзіцячых лагерах — у самым разгары!

Пад'ём — у восем трыццаць. Пасля — зарадка, лінейка і сняданак. Усё — хутка і весела. Менавіта так пачынаецца раніца ў хлопчыкаў і дзяўчынак у «Брыганціне». Сёлета ў гэтым спартыўна-аздараўленчым комплексе БДУ адпачывае 320 дзяцей. Узрост — ад шасці да чатырнаццаці гадоў. Тут, у лясным маляўнічым масіве на беразе возера непадалёку ад Радашковіч, хлопчыкі і дзяўчынкі з задавальненнем бавяць час. Гурткі па выяўленчым і дэкаратыўна-прыкладным мастацтве, абавязковыя заняткі ў басейне і, безумоўна, шмат цікавых і актыўных заняткаў.

— Кожную хвілінку дзіця павінна быць занятае, — упэўнены дырэктар комплексу Уладзімір ПАЛЯКОЎ. — У нашых хлопчыкаў і дзяўчынак — цікавыя і насычаныя дні. Вялікая колькасць спаборніцтваў, квэсты, дыскатэкі, прагляд фільмаў. І, вядома, безліч эмоцый.

Матэрыялы паласы падрыхтавалі Святлана БУСЬКО, Марына БЕГУНКОВА (фота).

АПЛАЦІЦЬ КАМУНАЛКУ ЗА ПАРУ ХВІЛІН

З чэрвеня ў паштовыя скрынкі ў Беларусі прыходзяць квіткі на аплату камунальных паслуг, у правым верхнім куце якіх нанесены QR-код. З яго дапамогай за лічаныя хвіліны можна аплаціць выстаўлены рахунак як праз мабільную праграму, так і на пошце.

ИЗВЕЩЕНИЕ за май 2018 года
коммунальные услуги и платы за пользование жилым помещением

Организация, начисляющая плату за ЖК услуги: Филиал "Единый расчетно-справочный центр г.Минска" коммунального унитарного предприятия "Центр информационных технологий Мингорисполкома"

Организация, перечисляющая плату Исполнителям ЖК услуг: ОАО «Небанковская кредитно-финансовая организация «ЕРИП»

Банк: ОАО «Небанковская кредитно финансовая организация «ЕРИП»

БИК банка: SSISBY2S Счет: BY44SSIS38190000000120000000 УНП: 807000268

QR-код для оплаты в ЕРИП

	Единица измерения услуги	Объем (кол-во)	Тариф (рублей)	Начислено (рублей)	Сумма соц. льготы (рублей)	Сумма перерасчета (рублей)	Итого сумма (рублей)
(дируемым тарифам)							
	м.кв.	29.23	0.1187	3.47	0.00	0.00	3.47
	м.кв.	29.23	0.0953	2.79	0.00	0.00	2.79
	Гкал	0.0647	16.9259	1.10	0.00	0.13	1.23
	м.куб	3	0.8053	2.41	0.00	0.00	2.41
	м.куб	3	0.5398	1.62	0.00	0.00	1.62
	чел.	1	2.6200	2.62	0.00	0.00	2.62
ами	м.куб	0.2233	6.0055	1.34	0.00	0.00	1.34
	чел.	1	0.4919	0.49	0.00	0.00	0.49

Што такое QR-код?

Гэта англамоўная абрэвіятура ад слоў Quick Response Code. У перакладзе гэта азначае «код хуткага рэагавання». Фактычна гэта — разнавіднасць штрыхкода, якую счытвае спецыяльная праграма-сканер. Як правіла, выкарыстоўваюцца яны ў смартфонах. QR-код утрымлівае ў сабе інфармацыю аб аб'екце, да якога ён прывязаны. Як правіла, гэта тэкставая інфармацыя. QR-код складаецца з чорных квадратаў у квадратнай сетцы на белым фоне. Па гарызанталі і вертыкалі ў яго «зашыты» шаблоны, якія і ўтрымліваюць у сабе зашыфраваны тэкст. Упершыню QR-код быў прадстаўлены ў 1994 годзе.

Паспрабуем аплаціць камуналку па-новаму. Камера просценькага смартфона падносіцца блізка, але не ўшчыльную (аптымальна на адлегласць у 8—10 сантыметраў) да выявы QR-кода. Запускаем сканер кода — у маім выпадку дадатак ужо ішоў «у камплекце» аперацыйнай сістэмы тэлефона, але нават калі гэтага і няма, то можна яго спампаваць абсалютна бясплатна ў краме Google Play Market. Адна-дзве секунды — і на экране з'яўляецца спасылка, па якой трэба перайсці да аплаты. Два пацвярджальныя націскі — і перада мной з'яўляецца асабісты рахунак, а таксама поле, дзе трэба ўвесці даныя з лічыльнікаў гарачай і халоднай вады. Далей кіруюся інструкцыямі, якія з'яўляюцца на экране. Націскаю віртуальную кнопку «Аплаціць» — і ўсё, працэс завершаны. Уся праца заняла не больш за тры хвіліны. І не трэба кудысьці выходзіць з дому.

Але што рабіць тым, хто, напрыклад, смартфона не мае, ці пажылым людзям, якім з прычыны ўзросту ўжо складана засвойваць новыя тэхналогіі? Рашэнне знойдзена. Ужо з чэрвеня аплаціць рахунак за камунальныя паслугі з дапамогай новай тэхналогіі можна будзе і ў некаторых паштовых аддзяленнях у Мінску. Сканерамі QR-кодаў будзе абсталявана ў іх як мінімум адно працоўнае месца. Што трэба будзе зрабіць для аплаты? Проста перадайце аператару квітанцыю з кодам. З дапамогай сканера аператар счытае зашыфраваную ў кодзе інфармацыю і прыступіць да апрацоўкі плацяжу. Прычым зробіць гэта значна хутчэй, чым па традыцыйнай схеме. У чым сакрэт эканоміі часу? Аператару не давядзецца кожны раз набіраць з нуля лічбы асабістага рахунку. Гэтая работа робіцца вельмі пільна, каб не пераблытаць рахунак, і таму можа крыху расцягвацца па часе.

Мяркуецца, што з цягам часу такіх «прасунутых» аддзяленняў будзе больш.

Цяпер магчымасць аплаты з дапамогай QR-кода даюць сваім кліентам Белінвестбанк і БТА-Банк. Іншыя банкі ўжо разглядаюць магчымасць дадавання неабходных функцый у свае мабільныя праграмы.

Фота БелТА

Дзень падпісчыка прайшоў учора на мінскім Галоўпаштамце. Прадстаўнікі газет правялі прэзентацыі сваіх выданняў, расказалі пра новыя праекты.

На здымку: супрацоўніца аддзела падпіскі і маркетынгу РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» Юлія КАВАЛЁВА.

Высокая пазіцыя

Сусветны паштовы саюз абнародаваў параўнальны інтэграваны індэкс паштовага развіцця. Са 173 паштовых аператараў краін свету, якія ўвайшлі ў рэйтынг, «Белпошта» заняла 32-е месца!

Рэйтынг складаўся з улікам чатырох крытэрыяў. Гэта ахоп, надзейнасць, рэлевантнасць і ўстойлівасць.

Тройка найлепшых паштовых службаў працуе ў Швейцарыі, Нідэрландах і Японіі. Эксперты Сусветнага паштовага саюза прызнаюць, што гэтыя тры краіны здолелі выбудаваць усёахопную сетку, якая выклікае найбольшы давер і ўвесь час імкнецца развіваць новыя тэхналогіі.

Суседзямі ж Беларусі па рэйтынгу сталі Харватыя і Украіна, якія размясціліся на 31-й і 33-й пазіцыях адпаведна.

Сярод былых савецкіх рэспублік перасягнуць нашу краіну ў рэйтынгу здолелі толькі тры. Гэта Эстонія (13-е месца), Літва (22-е) і Малдова (27-е). З астатніх геаграфічных суседзяў Беларусі больш высокі рэйтынг работы паштовага аператара прысвоены Польшчы (6-е месца). А вось службы Расіі і Латвіі паказалі горшы вынік — 37-е і 43-е месцы адпаведна.

Прымераць абноўку... на пошце

Заказ абутку і вопраткі праз інтэрнэт-крамы набірае папулярнасць. На карысць пакупнікоў іграе вельмі багаты асартымент, ніжэйшы кошт і магчымасць не марнаваць час, ездзячы па звычайных магазінах. Зрэшты, ёсць тут і адзін мінус. Абутак і вопратку трэба прымяраць перад купляй — хто ведае, можа, чаравікі будуць звальвацца з ног або, наадварот, крыху ціснуць. У звычайнай краме праблема вырашаецца проста — паставіў рэч на паліцу і ўзяў іншую.

Ад чэрвеня «Белпошта» запускае новую паслугу па прымерцы і частковым выкупе тавару, заказанага ў інтэрнэт-крамах. Калі нейкая абноўка не падыдзе, то яе можна будзе аформіць на вяртанне прадаўцу адразу на месцы. Паслуга аказваецца ў рамках пакетаў паслуг E-commerce. Праўда, скарыстацца новай магчымасцю можна пакуль не ва ўсіх паштовых аддзяленнях. Іх падрабязны спіс знаходзіцца на сайце «Белпошты».

Матэрыялы падрыхтаваў Валяр'ян ШКЛЕННІК.

■ Філатэлія

У ГОНАР СПАРТАКА МІРАНОВІЧА

Легендарны трэнер гандбольнай каманды «СКА-Мінск» Спартак Мірановіч 20 чэрвеня святкуе 80-годдзе. 40 гадоў — з 1976-га па 2016 год — ён аддаў сталічнай дружыне. І не без поспеху — у паслужным спісе СКА тры перамогі на Кубку еўрапейскіх чэмпіёнаў, двойчы — Суперкубак, шэсць разоў — чэмпіянат СССР і тры — Кубак СССР. У 1986 годзе Спартак Пятровіч стаў на чале зборнай СССР па гандболе, якая прывезла праз два гады з XXIV Алімпійскіх гульняў у Сеуле медаль найвышэйшай пробы.

Ужо ў часы незалежнай Беларусі армейцы пад кіраўніцтвам Спартака Мірановіча выйгралі дзесяць разоў чэмпіянат краіны, шэсць разоў станавіліся найлепшымі ў Кубку Беларусі і неаднаразова заваёўвалі Кубак Балтыйскай лігі.

Працуе ў Мінску і дзіцяча-юнацкая спартыўная школа, якая носіць імя праслаўленага трэнера. Да юбілею заслужанага трэнера БССР і СССР «Белпошта» аддрукавала спецыяльны мастацкі маркіраваны канверт. На ім адлюстраваныя лагатып гандбольнага клуба «СКА-Мінск», партрэт Спартака Мірановіча і выявы гульцоў клуба.

Канверт аддрукаваны тыражом 30 тысяч экзэмпляраў. Памятнае гашэнне адбудзецца 20 чэрвеня ў аддзяленні паштовай сувязі № 1 Мінска, што знаходзіцца на вуліцы Маскоўскай, 16. Дзеля гэтага Міністэрства сувязі і інфарматызацыі запускае ў абарачэнне памятны спецыяльны штэмпель ■

Рыхтуй бочкі летам! Са «Звяздой»!

13 ліпеня сярод сваіх падпісчыкаў на трэці квартал або другое паўгоддзе «Звязда» разыграе сем дубовых бочак ёмістасцю 10 літраў і адну (суперпрыз) — ёмістасцю 30!

Не забудзьцеся запоўніць купон *(глядзі справа)*, выразаць яго і да 11 ліпеня даслаць у рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а. А ўжо далей...

Вам пашанцуе!

Падрабязныя правілы гульні змешчаны ў нумары за 31 мая. Тэрміны правядзення гульні — з 01.06.2018 да 30.09.2018.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3284 ад 25.05.2018 г., выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або II паўгоддзе 2018 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска афармлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)

на III квартал або II паўгоддзе 2018 года

Хатні адрас і тэлефон _____
(абавязкова)

(індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

НЕ ПРОСТА МОДА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Лічбавая трансфармацыя — не мода і не часовая з'ява, а працэс, у які трэба пагрузіцца як мага хутчэй, каб атрымаць максімальную карысць, — падзяліўся сваімі думкамі **дырэктар Галоўнага інфармацыйна-аналітычнага цэнтра (ГІАЦ) Міністэрства адукацыі Павел ЛІС.** — Адукацыя — гэта падмурак для эканомікі, тым больш інавацыйнай. Адпаведна, лічбавая трансфармацыя адукацыі — працэс, які павінен адбывацца непасрэдна ў гэту хвіліну. Нельга яго ігнараваць ці чакаць, што ён пройдзе міма. Лічу, што мы, як прадстаўнікі адукацыі, павінны быць наватарамі і ініцыятарамі перамен. У нас ёсць усе шанцы стаць лакаматывам, які будзе рухаць наперад эканоміку. Але ёсць і шэраг праблем, адна з галоўных — гэта матывацыя педагагічных работнікаў.

Павел ЛІС: «Мы будзем або першыя, або ўжо не мае сэнсу, якія мы будзем...»

Часта даводзіцца чуць, што ўкараненне новых тэхналогій, як праграмных, так і тэхнічных, гэта складана: маўляў, у педагогаў не той узрост, не тыя кампетэнцыі, але насамрэч у многіх установах адукацыі Гродзенскай, Брэсцкай, Гомельскай абласцей і Мінска ёсць вельмі цікавыя падыходы і сур'ёзныя пункты росту ў гэтым кірунку, і мы бачым, як педагогі з 30-гадовым вопытам работы спакойна асвойваюць новыя тэхнічныя рашэнні: тыя ж інтэрактыўныя панэлі, электронныя сродкі навучання... Таму ўзнікае заканамернае пытанне: чаму адны матываваныя і ў стане гэта зрабіць, а іншыя не зацікаўлены?

Сёння на парадку дня стаіць стварэнне рэспубліканскага інфармацыйна-адукацыйнага асяроддзя (упершыню гэта ідэя была агучана ў 2016 годзе). Спецыялісты Галоўнага інфармацыйна-аналітычнага цэнтра займаліся вывучэннем аналагічных сістэм у Паўночнай Амерыцы, Азіі і Еўропе. Іх увагу прыцягнулі прыклады, калі дзяржава і педагагічнае грамадства падтрымліваюць такія платформенныя рашэнні, дзе пункт уваходу ў сістэму — адзіны. Гэта значыць, што з яго можна трапіць на інфармацыю любога ўзроўню: ад простага даведачнага тэксту да складаных сэрвісаў. Прычым гэта можа зрабіць любы ўдзельнік адукацыйнага працэсу: ад школьніка да прадстаўніка вышэйшага менеджменту ў адукацыі.

— Мы таксама пойдзем гэтым шляхам. Усе нашы разрозненыя рэсурсы будуць аб'ядноўвацца на адзінай платформе, — паведаміў Павел Ліс. — Прычым рэгламенты дзеяння падобнага асяроддзя будуць адкрыты і для дзяржаўных, і для прыватных партнёраў. Уся інфраструктура павінна быць празрыстай і зразумелай як нам (тым, хто ёй кіруе), так і тым, хто ёй карыстаецца. Які паток інфармацыі мы збіраемся акумуляваць на адзінай платформе? Зараз распрацоўваецца рэгістр навучэнцаў. У першую чаргу ён важны для міжведамаснага ўзаемадзеяння, а таксама для Міністэрства адукацыі, каб мы маглі бачыць профіль кожнага навучэнца — ад яго залічэння ў дзіцячы садок да заканчэння ўніверсітэта (адпаведна абнаўленне будзе адбывацца пастаянна). Менш дынамічны — рэгістр установаў адукацыі (ён ужо гатовы). Таксама на платформе будуць прадстаўлены рэгістр педагагічных работнікаў і статыстычныя сістэмы ГІАЦ. У найбліжэйшай перспектыве больш актыўна будуць укараняцца сістэма маніторынгу паспяховасці, воблачная бухгалтэрыя, беспапяровы дакументабарот, адзіны карпарацыйны паштовы сэрвіс, офісны пакет, электронныя плацяжы, дыстанцыйнае навучанне. Адзіны карпарацыйны паштовы сэрвіс надзвычай важны, паколькі сёння большасць установаў адукацыі карыстаецца бясплатнымі паштовымі сэрвісамі, якія не гарантуюць ніякай абароны інфармацыі.

Таксама для эфектыўнай трансфармацыі ў адукацыйны працэс павінны ўкараняцца сучасныя тэхналогіі: штучны інтэлект і нейронныя сеткі, віртуалізацыя адукацыйнага працэсу (дапоўненая рэальнасць), блокчэйн. У сістэме адукацыі тэхналогія блокчэйну можа выкарыстоўвацца для пацвярджэння сапраўднасці электронных дакументаў.

Чужыя тут не ходзяць

— Штучны інтэлект — гэта не кібарг, а набор тэхналогій, аб'яднаных агульнай назвай, якія могуць палепшыць наша жыццё, — тлумачыць **дырэктар ТАА «Сінезіс Стратус» Сяргей ПАБЛАГУЕЎ.** — Напрыклад, у школе ёсць шмат працэсаў, якія можна спрасціць: я маю на ўвазе бяспеку, арганізацыю на яе тэрыторыі прапускнога рэжыму ці працэсы, якія патрабуюць ідэнтыфікацыі асобы, скажам, пры атрыманні харчавання. Гэта можна рабіць з выкарыстаннем ужо даступных інструментаў, якія ёсць на ўзбраенні нашай кампаніі. У прыватнасці, я кажу пра сістэму відэааналітыкі Kipod, якая ўмее распазнаваць асобу.

Сяргей ПАБЛАГУЕЎ: «Трэба выходзіць з зоны камфорту і спрабаваць штосьці змяніць...»

У адной са сталічных школ ужо распачаліся выпрабаванні сістэмы бяспекі на аснове штучнага інтэлекту: у будынку і на яе тэрыторыі ўстаноўлены камеры, здольныя ў рэжыме рэальнага часу ідэнтыфікаваць усіх наведвальнікаў па прынцыпе «свой—чужы».

Сістэма здольная не толькі распазнаваць (з дакладнасцю 95—98 працэнтаў) і весці ўлік вучняў, але і адпраўляць праз месенджары інфармацыю іх бацькам (калі дзіця прыйшло ці пакінула тэрыторыю школы). Яна больш надзейная, чым карткавая, якой карыстаюцца зараз паўсюдна. Колькасць людзей у кадры неабмежаваная плюс платформа імгненна вызначае, хто перад камерай — свой вучань або староннія дарослыя ці дзеці. Для новых наведвальнікаў школы прадугледжана хуткая рэгістрацыя праз месенджар. А інфармацыя аб незарэгістраваных «гасцях» адразу паступае ў службу бяспекі.

Пастаянных вучняў і персанал ўключаюць у базу даных (для гэтага хапае аднаго рабочага дня). Далей штучны інтэлект сам збірае і запамінае інфармацыю аб іх адзенні, прычосцы, узроставых змяненнях, што адбываюцца. Гэта павялічвае дакладнасць распазнавання. Дзякуючы новай тэхналогіі не трэба правяраць наведвальнасць па спісе, сістэма робіць гэта сама.

Kipod ужо працуе ў маскоўскім і мінскім метро, Генштабе ўзброеных сіл у Расіі, сістэму выкарыстоўваюць Міністэрства абароны, Дзяржаўны мытны камітэт і МУС Беларусі і Азербайджана. Год таму кіраўніком нашай дзяржавы было прынята рашэнне аб стварэнні рэспубліканскай сістэмы маніторынгу грамадскай бяспекі. Ужо абвешчаны конкурс на выбар тэхнічнага аператара платформы маніторынгу. «Я лічу, што інтэграцыя школ у гэту сістэму вельмі важная, — падкрэслівае Сяргей Паблагуеў, — ім трэба толькі ўбудавацца ў сістэму, на якую збіраюцца выдаткаваць сотні мільёнаў долараў. Хтосьці можа мне запярэчыць і сказаць, што сёння для многіх кіраўнікоў больш актуальны рамонт класа, але калі мы не пагрузімся ў лічбавую трансфармацыю і не пачнём ёй кіраваць, то заўтра ўжо яна пачне кіраваць намі».

Хто спіць на ўроку?

Яшчэ адна магчымасць — вызначэнне інтэлектуальнымі сістэмамі эмоцый людзей і атрыманне зваротнай сувязі. Як запэўнівае Сяргей Паблагуеў, распазнаванне — рэальна складаная матэматычная задача, але для сучасных сістэм аналітыкі яна цалкам вырашальная. Ад таго, што расказваюць спецыялісты, проста займае дух. Атрымліваючы даныя са шматлікіх крыніц, можна «ўбачыць» не толькі, што дзеці па ўсёй краіне «спяць» на пэўных уроках (скажам, на гісторыі пасля матэматыкі ці фізкультуры), а як успрымаецца навучэнцамі той ці іншы вучэбны матэрыял (не ўсё ж, у рэшце рэшт, залежыць ад настаўніка). Якая тэма «кульгае»? Толькі ў адным рэгіёне ці па ўсёй краіне? Гэта інфармацыя будзе карыснай тым, хто стварае вучэбныя праграмы і піша падручнікі, складае школьны расклад. У які час лепш распачынаць заняткі? Гэта таксама можна прааналізаваць. Напрыклад, можна сабраць з усёй краіны інфармацыю па паспяховасці дзяцей па пэўным прадмеце па канкрэтнай тэме ў канкрэтны адрэзак часу. Рэакцыя, зафіксаваная ў адным класе, канешне, не рэпрэзентатыўная, але калі такіх рэакцый тысячы па ўсёй краіне! Абыякавасць, самота, раздражненне, агрэсія — усе эмоцыі фіксуюцца, і на падставе іх аналізу робяцца адпаведныя высновы. Гэта можа стаць дадатковым інструментам для спецыялістаў. Можна аператыўна ўнесці змяненні ў праграму, адкарэктаваць пэўныя нюансы, бо, напрыклад, тэма можа быць выкладзена так, што дарослым яна зразумелая, а дзецям — не. Узнікае пытанне, а ці падтрымаюць прысутнасць штучнага інтэлекту ў вучэбных аўдыторыях настаўнікі, бо многія могуць разглядаць укараненне такой сістэмы, як кантроль за іх працай?

— Я лічу, што трэба выходзіць з зоны камфорту і спрабаваць штосьці змяніць, — кажа Сяргей Паблагуеў.

— У нас ёсць шанц стаць лакаматывам, які будзе рухаць не толькі ўсю сістэму адукацыі, але і эканоміку ў цэлым, — лічыць Павел Ліс. — Хуткасць прыняцца рашэнняў надзвычай важная. Мы будзем або першыя, або ўжо не мае сэнсу, якія мы будзем...

ЯК ПАВЫСІЦЬ СВАЕ ШАНЦЫ НА ЦТ?

Больш як 45 тысяч чалавек прыйдуць у панядзелак у пункты правядзення тэсціравання, каб здаць экзамен па матэматыцы. А на тэсты па фізіцы запісаліся 25,5 тысячы чалавек. Гэтыя дзве дысцыпліны для абітурыентаў традыцыйна самыя складаныя, таму і сярэдні бал па іх самы нізкі. Між іншым, поспех на экзамене залежыць ад многіх фактараў, у тым ліку і ад псіхалагічнага стану самога абітурыента, яго нацэленасці на вынік. Каб павысіць шанцы на ЦТ, мы дадзім абітурыентам некалькі парад, якія могуць аказацца карыснымі.

У час падрыхтоўкі да іспытаў належыць працаваць з тэставым матэрыялам, розным па форме падачы, каб на тэсціраванні не прапусціць ключавой інфармацыі. Прыйшоўшы на цэнтралізаванае тэсціраванне, абітурыент спадзяецца ўбачыць ужо знаёмыя і адпрацаваныя тыпы заданняў, якія ён неаднойчы рашаў з настаўнікамі ці самастойна. Але часам нават нязначнае змяненне фармулёўкі збівае яго з толку і прымушае ўсумніцца ва ўласных ведах.

Алгарытм рашэння задачы павінен узнікаць ужо ў працэсе чытання ўмовы. Першыя заданні ўвогуле можна рашаць вусна, але для гэтага трэба, як кажуць, набіць руку. Адна з самых распаўсюджаных памылак — гэта ўспрыманне памераў задачы: абітурыентам здаецца, што чым большая па аб'ёме задача, тым больш складана яна рашаецца. На практыцы ў большасці выпадкаў гэта не так. Чым больш аб'ёмная ўмова задачы, тым больш яна змяшчае зыходных даных.

Даволі часта ўказанне на правільны алгарытм рашэння змяшчаецца ў самой умове задачы і канцэнтрацыя ўвагі на ёй дапамагае гэты алгарытм распазнаць. Некаторыя заданні можна рашаць больш хутка, калі не шукаць адразу правільны адказ, а паслядоўна выключаць тыя, якія яўна не падыходзяць. Метад выключэння дазваляе канцэнтраваць увагу на адным-двух варыянтах, што значна спрашчае задачу.

Нярэдка прычынай дапушчаных на тэсціраванні па фізіцы і хіміі пралікаў становіцца матэматычная падрыхтоўка: гэта значыць, што, правільна рашыўшы задачу «фізічна», абітурыенты дапускаюць памылкі ў рашэнні сістэмы ўраўненняў, у матэматычных пераўтварэннях формул, пры выкананні дзеянняў з вектарамі, трыганаметрычнымі функцыямі і гэтак далей. Некаторыя абітурыенты памыляюцца пры аналізе графікаў, не могуць прымяніць правілы прыблізных вылічэнняў, правільна акругліць канчатковы адказ, не ўлічваюць вектарны характар фізічных велічынь.

Правільная самаарганізацыя — залог поспеху на ЦТ. Педагагічныя тэсты — не школьная кантрольная работа, і дэфіцыт часу — адна з умоў выканання тэста, якая дазваляе дыферэнцаваць абітурыентаў па ўзроўні іх падрыхтоўкі. Трэба вучыцца пераразмяркоўваць час: выкананне заданняў 1-2 узроўняў складанасці трэба даводзіць да аўтаматызму, каб больш часу засталося для рашэння разліковых задач і ланцужкоў пераўтварэнняў. Апошнія 10—15 хвілін прысвяціце праверцы правільнасці запаўнення бланка адказаў, бо кожная памылка ў адказе, у тым ліку апіска, дапушчаная ў момант запаўнення бланка, прыводзіць да таго, што задача лічыцца нярэшанай, таму не спяшайцеся запаўняць бланк адказаў. Памятайце, што выправіць можна толькі шэсць памылковых адказаў у частцы «А». Рэкамендуецца ўсе атрыманыя адказы пазначаць спачатку не ў бланку, а ў чарнавіку, і толькі пад канец экзамену, калі ўсё адно наўрад ці вы зможаце рашыць яшчэ хоць адно заданне, запаўняць бланк адказаў.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Памылкі на ЦТ па фізіцы могуць быць звязаны з няўменнем прымяняць законы фізікі ў канкрэтных сітуацыях. Многія абітурыенты няправільна рашаюць задачы з прычыны фармальнага ведання фармулёвак асноўных фізічных законаў, іх матэматычных выражэнняў, няўважлівага прачытання ўмоў задач і малюнкаў, што іх суправаджаюць. Замест уважлівага аналізу ўмоў задачы ўдзельнікі тэсціравання спрабуюць проста «падабраць» формулу, якая, на іх погляд, падыходзіць, і «падставіць» значэнні зададзеных велічынь (адна з найбольш распаўсюджаных памылак).

Калі лічбавы адказ атрымліваецца ў выглядзе дробу, то яго трэба акругліць да цэлай лічбы па правілах матэматычнага акруглення. Нельга запісваць адказ у выглядзе матэматычнай формулы ці выразу. Нельга ўказваць таксама і адзінкі вымярэння (градусы, працэнты, метры, тоны), рабіць каментарыі да лічбы.

Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.

■ Вёскі, якія знікаюць: апошнія жыхары

Любель-Поль
Пінскага раёна

Людзей палілі ў хляве, хто выбягаў — сустракалі агнём

Гэтымі днямі споўнілася 75 гадоў, як знішчылі жыхароў вёсак Любель-Поль і суседняй Вулькі Гарадзішчанскай. Любель-Поль раздзяліў лёс Хатыні, яго знішчаў, што і Хатынь, той самы 118-ы карны батальён. Крывавы досвед у байцоў гэтага падраздзялення быў ужо немалы. Таму жыхароў збіралі ў групу прафесійна, з веданнем справы, праўда, дзейнічалі хутка, нібы без папярэдняга загаду.

Іван Каржаневіч ведае гэтую страшную гісторыю ад сваіх бацькоў, дзядоў і бабуль. Бацькі таксама ведалі найбольш з расказаў бацькоў. Адным словам, немцы стаялі ў суседняй Вульцы. Кругом лясы і балоты, партызанскі край. Адзін з вайскоўцаў-акупантаў, які стаяў у дазоры, заўважыў рух, увязаўся ў перастрэлку з партызанамі. Гэтага хапіла, каб падпісаць смяротны прыгавор абедзвюм вёскам. Людзей вялі ў Любель-Поль і з Вулькі, усіх зганялі ў хлеў на сядзібе Антона Жылевіча, дзеда Івана Каржаневіча. У нейкі момант сяляне зразумелі, што гэта іх апошняя дарога, і рашыліся ўцякаць. Хто пабег у бок цяперашняй шашы, застаўся жыць: акупант, які стаяў там, страляў уверх, даваў людзям выратавацца. Хто выбраў супрацьлеглы напрамак, таго дагнала куля. Астатніх спалілі ў хляве. Калі загарэлася, людзі рынуліся ў дзверы, іх сустракалі кулямётным агнём. Толькі адна дзяўчынка Таццяна Пронька, калі яе збілі з ног, упала і праляжала пад целамі, аж пакуль усё не сціхла. Яна ў тым пекле засталася жывой. Адна са 105 ахвяр. Цяпер бабуля Таццяна жыве ў дзяцей у Мінску.

Бабулі Івана Каржаневіча ў той страшны дзень таксама пашанцавала выжыць, інакш і не было б цяпер Івана... Надзея Антонаўна пабегла ў бок цяперашняй бетонкі з малымі дзецьмі. Самы малы, амаль двухгадовы сын, быў у яе за плячыма. Беглі па балоце, рызыкуючы ўскочыць у багну, пад плач дзяцей і галашэнне старых. Яна потым доўга не магла асэнсаваць, як не заўважыла, што дзіця вывалілася з фартуховага капшука, проста не адчула. А калі агледзела, ёй не далі вярнуцца астатнія: «Сама загінеш, а ў цябе яшчэ шасцёра дзяцей!» Так і сядзела ў схованцы, пакуль у лу ўжо закрылі, давялося хадзіць у Вульку за чатыры з паловай кіламетры. Як толькі не дабіраліся! — згадвае Іван Іванавіч. — Зімой на лыжах ездзілі, а калі Ясельда разлівалася і ўсё замярзала, нават на каньках, цяплом — на веласіпедзе. Гэта цяпер, калі і адно дзіця ў вёсцы жыве за кіламетр ад школы, за ім абавязкова прыйдзе школьны аўтобус, а тады дарога была нашай праблемай. Але ж нічога, жылі, часам даволі весела і цікава.

вёсцы ўсё не заціхла. Потым пайшла назад шукаць сваё дзіцятка і знайшла яго! Па плачы. Дзіва, што не загінуў у балоце, што не з'еў які звер, тут звяр'я заўсёды была процьма. Малога выратавала, сямёра дзяцей выгадавала.

Калі яны вярнуліся ў вёску, давялося хаваць родных і блізкіх, а таксама суседзяў, тых, каго хаваць не было каму. Цікава, што хаты карнікі паліць не сталі, мабыць, некуды спяшаліся.

Вяскоўцы, што засталіся, сталі наладжваць жыццё.

— Бацькавы бацькі тут жылі, — расказвае Іван Каржаневіч. — Тут і я з'явіўся на свет, малодшы ў сям'і. Пасля вайны нават пачатковая школа ў Любель-Полі адкрылася, мае старэйшыя браты хадзілі. Калі ж мне прыйшоў час выпраўляцца ў першы клас у 1973 годзе, шко-

Электрычнасць прыйшла сюды недзе ў годзе 69-м ці 70-м. Помню, як бацькі адразу купілі тэлевізар. У нашы балоты лінію электраперадачы цягнулі адной з апошніх у раёне. Тут жа дарогі не было, гэту бетонку, па якой вы прыехалі, пабудавалі ў 80-м разам з алімпійскімі аб'ектамі. Раней сувязь са светам была праз Вульку або на лодцы праз раку. Неяк і не заўважаліся такія нязручнасці. На танцы збіраліся ў вялікай хаце. Калі гулялі вяселле ў адной хаце, танцаваць ішлі ў суседнюю. Бацькі ўсё жыццё працавалі: маці ў калгасе, бацька лесніком. Трымалі вялікую гаспадарку: былі свае карова, конь, свінні, птушка, — згадвае ўраджэнец Любель-Поля.

Пасля школы Іван Каржаневіч скончыў тэхнікум, адслужыў у войску, стварыў сям'ю, пажыў некалькі гадоў у горадзе і зразумеў, што гэта не яго. Таму свой дом пабудаваў у вёсцы Высокае, там, дзе знайшлася работа. Пакуль былі жывыя бацькі, заўсёды прыязджаў сюды, дапамагаў. А калі іх не стала, не змог пакінуць родную хату, даць зарасці агароду. Хоць, здавалася б, сам жыве ў вёсцы, мае кавалак зямлі побач з домам. «Малая радзіма — гэта не пустыя словы, — кажа мой суразмоўца. — Цягне сюды і ўсё. Любы выхадны дзень, вольную гадзіну еду, нешта раблю ў двары, корпаюся ў агародзе. Вось і ў суседнім доме, даўно нікога няма, дзеці не прыязджаюць, а гады два таму сталі прыязджаць унукі, навялі парадак, нейкую градку клубніц пасадзілі, значыць, не прападзе сядзіба».

Старшыня Аснежыцкага сельскага Савета Валерый КІРЫЛКА кажа, што ў вёсцы зарэгістравана некалькі чалавек, але апошнія жыхары яе жывуць у дзяцей у гарадах. Нават летам тут можна сустрэць толькі іх дзяцей і ўнукаў. Праўда, цяпер назіраецца цікавасць да ўчасткаў пад будаўніцтва. Некаторыя ўжо ўзвялі пабудовы і выкарыстоўваюць іх як летнікі.

Валерый Аляксандравіч звяртае ўвагу на капліцу, якую пабудавалі некалі самі жыхары ў памяць аб трагедыі. Цяпер сельскі Савет падтрымлівае каплічку ў належным стане. А помнік, які паставілі ў 1990 годзе на месцы хлява, спаленага з людзьмі, даглядае НПС «Пінск» ААТ «Гомельтранснафта «Дружба». Раней тут стаяў крыж. 27 гадоў таму яго змянілі на абеліск, на плітах якога ўвекавечылі імёны ўсіх загінулых. Цяпер сюды нясуць вянкі і кветкі, як і нядаўна з выпадку 75-й гадавіны трагедыі.

Яшчэ Валерый Кірылка паказаў сціплы, крыху разбураны помнік, які стаіць недалёка ад капліцы, у зарасніку бэзу. Старшыня раней і сам не ведаў пра яго існаванне, старажылы паказалі. Гэта таксама адзін з помнікаў ахвярам таго жахлівага чэрвеньскага дня. Дзяўчына-масквічка прыехала ў госці да сваякоў перад самай вайной, загасцявалася ў вёсцы. Праз некаторы час прыехаў і яе жаніх, відаць, пазнаёміцца. Яны ўжо хацелі вяртацца, ды наступіла 22 чэрвеня. Не паспелі ачомацца, як аказаліся на акупаванай тэрыторыі. Выехаць у Маскву стала немагчыма, так і прабылі тут да 43-га года, і згарэлі ў тым самым хляве. Чаму іх пахавалі асобна, а не на могілках з іншымі вяскоўцамі, цяпер дакладна ніхто не скажа, ды і няма каму сказаць. Але пахавалі тут, дзе цяпер разрослася бэз. Старшыня сельвыканкама сказаў, што гэты сціплы абеліск таксама хутка прывядуць у парадак. Памяць павінна жыць.

А старшыня раённага Савета Іосіф ГУЗІЧ упэўнены, што вёска Любель-Поль не знікне з карты раёна. На яе звярнулі ўвагу гараджане. Адзін дом на ўскрайку купілі Таццяна і Валерый Кутузавы. Яны адкрылі аграсядзібу. Тут жа рай для турыстаў, якія шукаюць сустрэчы з сапраўднай прыродай: лес, балота, рака побач. Кутузавы распрацавалі экалагічныя сцяжыны, прапаноўваюць конныя прагулкі гасцям. Звяры падыходзяць ледзь не да дзвярэй сядзібы. «Зімой воўк прыходзіў, — паказвае Таццяна здымак на сваім тэлефоне, — казулькі, зайцы тут кожны дзень бегаюць». Цішыня, прыгажосць, шаша праходзіць за кіламетр ад вёскі. Жыць можна. Можа, хто і захоча, пабудаваўшы дом, пераехаць сюды на пастаяннае месца жыхарства. «Вёска адрадзілася пасля знішчэння ў 1943 годзе, яна павінна жыць нават дзеля памяці», — кажа Іосіф Гузіч.

Святлана ЯСКЕВІЧ

■

СУСТРЭНЕМСЯ Ў «ВЕРСАЛІ»

■ Мясцовы час

Мясцовыя жыхары з аграгарадка Гранічы, што ў Маладзечанскім раёне, на пытанне: «А дзе тут крама?» у адзін голас адказваюць «На скрыжаванні, каля помніка, не прапусціце!» І сапраўды, вялікая шыльда запрашае зазірнуць у новую краму маладога прадпрымальніка Анатоля ГАНЧАРА.

Дваццаціпяцігадовы Анатоль Ганчар толькі год у статусе індывідуальнага прадпрымальніка. Але ўжо паспеў папрацаваць у выязным гандлі — на сваёй машыне ездзіў па вёсках, прадаваў садавіну-гародніну, алей, крупы. Але праца складаная, асабліва зімой, на холадзе.

— Ды і даўно хацелася нейкай стабільнасці, каб на адным месцы быць, — дзеліцца Анатоль. — Аднойчы прыехаў сюды гандляваць, спадабаліся і месца (якраз пуставаў гэты будынак), і людзі. Параіліся з жонкай і вырашылі арандаваць памяшканне.

Але ўзніклі складанасці — на памяшканне не было даументаў, і паўгода прадпрымальнік плаціў арэнду «ўпустую».

— Галоўны страх быў, што мы не адкрыемся, — успамінае Анатоль. — Але ўсё склалася!

Маладая сям'я Ганчароў жыве ў вёсцы Краснае — гэта каля дзесяці кіламетраў ад Граніч. Кожны дзень Аляксандра і Анатоль прыязджаюць у сваю краму — тут яны і прадаўцы, і грузчыкі, і прыбіральшчыкі, і бухгалтары. Дарэчы, бухгалтарскую справу вывучалі самастойна — праз інтэрнэт. «Вельмі дапамагае падатковая служба, як толькі пытанні — адразу туды».

Для адкрыцця справы маладыя прадпрымальнік узяў крэдыт у «Беларусбанку» на пяць тысяч беларускіх рублёў, другі, на восем тысяч, ужо на адкрыццё крамы.

— Вядома ж, гэтых грошай не хапіла, — расказвае Анатоль. — Усё тое, што зарабіў на выязным гандлі, укладзена ў справу. У нечым адмаўлялі нават і дзеткам (жонка цяпер у дэкрэтным, трошкі бралі з «дзіцячых»). І зараз увесь прыбытак «ідзе» ў тавар. Але і не хацеў бы, каб на мяне ўсё «валілася з неба».

— Дома — двое дзетак. А крама — трэцяе, — дадае Аляксандра. — Большасць часу мы тут, на лета зрабілі зручны графік для пакупнікоў — у будні працуем да васьмі вечара, у выхадныя — да 23.00. Нават па муку прыходзяць ноччу!

Малады прадпрымальнік Анатоль ГАНЧАР.

Крама працуе толькі другі тыдзень, але мясцовыя з задавальненнем прыходзяць у «Версаль».

— Вёска вялікая, але добрага асартыменту тавару бракуе, — разводзіць рукамі прадпрымальнік. — Мы робім як для сябе — шырокі выбар каўбас і садавіны, малочкі. Аказалася, тут шмат малых, асабліва грудзічкоў, таму адразу сталі прадаваць сумесі, кашы. Зараз заключаем дагавор з «Беллактам» на дзіцячыя тваражкі, ёгурты.

Ад вяскоўцаў пачынаюць паступаць і заказы — камусьці трэба вядро на малако з вечкамі, іншаму — пакрышкі на колы. Анатоль ужо шукае, заключае дамовы, каб задаволеныя засталіся ўсе.

Сярэдні чэк пакупніка — дзесяць рублёў. Часцей за ўсё ў краму завітваюць дзеці і бабулі. Час ад часу тым, каму цяжка хадзіць, прадпрымальнікі падвозяць тавар дахаты.

Самы хадавы зараз — марожанае. У «Версалі» яго шаснаццаць відаў! Толькі за тыдзень прадаліся дваццаць скрыняў. Да сярэдзіны лета асартымент пашырыцца — падвязуць канцылярскія тавары, бо надыдзе час рыхтавацца да школы.

— Устанем на ногі — будзем прадумваць маркетынгавыя стратэгіі, — дзеляцца Аляксандра і Анатоль. — Зніжкі, напрыклад. А пакуль у планах — зрабіць такую краму, каб людзі прыходзілі не толькі нешта набываць, але і проста павітацца, пагаварыць.

Марына БЕГУНКОВА,
фота аўтара.

Маладзечанскі раён.

Наш культурны асяродак
Жыpандоля
Выпуск № 21 (417)

■ Прэм'ера

ЖЫВЫ, НЕБАРАКА!

Нікому такі герой быў не патрэбны. Ну, каму наогул патрэбны герой сярод лялек? Іх задача — па волі гаспадара забаўляць, усміхацца, танцаваць, разыгрываць гісторыі для людзей. Вось за нітачку пацягнулі — і Балерына закруцілася, за іншую цягнуць — Арап кідаецца ў скокі са сваім любімым какосам. І гэта ж цікава! Ну, як мінімум — каларытна. А чым можа здзівіць лялька Пятрушкі? Нязграбны небарака, непаслухмяны і непаваротлівы... Адны толькі «не». І яшчэ: не чакалі ад яго геройства, дакладна. Нават калегі-лялькі, кожная з якіх з'яўляецца служкам тэатра, за жыццём якога мы назіраем падчас прагляду балета «Пятрушка» кампазітара Ігара Стравінскага.

Балет з'явіўся ў рэпертуары Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра Беларусі. Але па вялікім рахунку гэта прэм'ера ўсё ж такі пачатку XX стагоддзя: адзін са спектакляў легендарных «Рускіх сезонаў» Сяргея Дзягілева, што некалі скарылі Еўропу, аднавіў на сцэне беларускага Вялікага народны артыст Расіі Андрыс Ліепа.

Зрэшчы, менавіта да гісторыі сусветнага балета і трэба адносіць гэтую пастаноўку. У пачатку мінулага стагоддзя «Рускія сезоны» здзейснілі сапраўдную рэвалюцыю, прычым не толькі сцэнічную, але і ў музыцы. У 1910 годзе быў пастаўлены балет «Жар-птушка», а «Пятрушка», што з'явіўся ў 1911 годзе, літаральна перавярнуў музычны свет Еўропы. Новае адчуванне XX стагоддзя прапанаваў Ігар Стравінскі: казачная гісторыя ў яго інтэрпрэтацыі набыла драматычнае гучанне і зусім не тыповы фінал для рускіх казак: дабро не абавязкова перамагае, нават калі нам гэтага вельмі хочацца. Напачатку ўсё і выглядае як казка...

Прэм'ера балета «Пятрушка» была прадстаўлена ў Парыжскім тэатры «Шатле» ў 1911 годзе і мела ашаламляльны поспех. У спалучэнні з музыкай Стравінскага харэаграфія Міхаіла Фокіна падавалася наватарскай. Але сюжэт і яго вырашэнне былі закладзеныя аўтарам лібрэта, заснавальнікам аб'яднання «Свет мастацтва» Аляксандрам Бенуа, які стварыў сцэнаграфію ў пастаноўцы.

Зразумела, чаму еўрапейскаму гледачу таго часу трэба было паказваць адметнасці Санкт-Пецярбурга: гэта была нябачаная экзотыка. Увесь гэты спектакль створаны з разлікам на «таго» гледача. Тут народныя гулянні (і матывы), просты люд, што весяліцца падчас Масленіцы, — дзіва дзіўнае, каб у вытанчаным балеце ў той час наогул паказвалі звычайных людзей «з вуліцы». А зрэшты — гэта ж у Парыжы... Па вопратцы зразумела, што за краіна і які гэта час. Нават мядзведзь, якога выводзяць на сцэну падчас народных гулянняў, з'яўляецца адным з сімвалаў культуры, якую «Рускія сезоны» адкрывалі Еўропе. Агаломшаная — калі нават у балеце ходзяць мядзведзі — Еўропа адрэагавала: «Ух!..» Такога яшчэ не бачылі.

Да таго ж дэкарацыі да спектакля, створаныя Аляксандрам Бенуа, малявалі Адміралцейства, Ісаакіеўскі сабор у Пецярбургу, а таксама Марсава поле, на якім, згодна з сюжэтам «Пятрушкі», працаваў балаганны тэатр. І яшчэ адзін наватарскі прыём для таго часу: перад намі разыгрываецца «тэатр у тэатры».

Толькі цяпер гэты прыём ужо звычайны. Казачнасць — зразумелая, а некаторыя сімвалы нават сталі культурнымі штампамі. Тым не менш сваю задачу як рэстаўратара балетнай гісторыі «Рускіх сезонаў» Андрыс Ліепа бачыў у тым, каб літаральна аднавіць тую пастаноўку.

З дэкарацыямі па эскізах Бенуа, з харэаграфіяй Фокіна (дзеля гэтага сустракаўся з яго ўнучкай). Узнаўляў дэталі, уважліва падыходзіў да адпрацоўкі народных танцаў, адказна падбіраў салістаў на кожную з партый казачных персанажаў.

Гарэзлівая балерына — Аляксандра Чыжык выконвала гэтую партыю падчас прэм'еры — круціць фуэтэ (прафесія такая), не асабліва задумваючыся пра складанасці жыцця, не звяртае ўвагі на закаханага Пятрушку. Навошта ёй гэты свойскі прастачок, калі побач ёсць больш перспектыўны замежнік-Арап? Пятрушка пакутуе-пакутуе, ды і даходзіць у сваіх унутраных пошуках да экзістэнцыйных пытанняў. І вось гэта, бадай, самае каштоўнае, што гучыць са сцэны для гледача XXI стагоддзя. Гучыць і праз музыку Стравінскага, дзе закладзены ўнутраны дыялог героя з самім сабою (яго нібыта чуеш словамі!), і праз рухі артыста — Алег Яромкін здолеў у гэтым эпізодзе сыграць сапраўдную трагедыю героя-адзіночкі, не падобнага да іншых, якія гатовы падпарадкоўвацца лялькаводу і разыгрываць патрэбны яму сюжэт. Ён імкнецца вырвацца з кола лялек і жыць уласным жыццём, будаваць іншы лёс, радаваць народ, калі яму гэтага хочацца.

Але навошта? Хто яго пра гэта прасіў? Не трэба адступаць ад прынятых сцэнарыяў. Ні народ, што весяліцца на вуліцы, ні калегі-лялькі нават не зразумелі, што гэта было. Тым больш што магутны Факір здольны пазбавіць сілы і ператварыць забіяку ў анучу, якую можна проста цягаць па падлозе, — і ўсе бачаць, што ён ёсць. Але энергія героя (нават пазбаўленага сілы і паніклага) нагадвае пра сябе — ён быў, ён ёсць і калі трэба...

Сумная руская казка. І праўдзівая: дабро, бывае, саступае пазіцыі, але дзеля таго, каб нам яшчэ больш захацелася яго перамогі. І можа быць вось гэтым нашым уласным жаданнем (і тым самым уцягваннем у расповед) кранае гэтая гісторыя цяпер.

Бо з пункту гледжання харэаграфіі яна ілюструе гісторыю балета (тым больш 100-гадовай даўніны), так, значную, адметную, але час узяў сваё і прасунуў гэтае мастацтва далей. І гісторыю «Рускіх сезонаў» мы ўжо не адкрываем: «Пятрушка» стаў трэцім балетам дзягілеўскай трупы, што ёсць у афішы нашага тэатра (дагэтуль Андрысам Ліепам былі адноўленыя «Шэхеразада» і «Жар-птушка»). Але гэты балет паказвае нашых артыстаў, якія здольныя партыю простага Пятрушкі сыграць як зорную трагічную ролю. І ён паказвае асобу, якая вырываецца з кола небыцця (бо якое ж быццё ў скрыні Факіра?) і ўваходзіць у жыццё праз учынак — іх проста не бывае ў стане «небыцця». Ляльку можна выкінуць, а ўчынак не забудзеш.

Ларыса ЦІМОШЫК.
Фота БелТА

■ Кінакрокі

ПРОСТЫЯ

Я трапіла ў дзіцячую лавіну, якая пад кіраўніцтвам настаўнікаў запоўніла залу кінатэатра «Піянер», дзе ішла новая стужка Нацыянальнай кінастудыі «Правілы геймера». «Табе страшна?» — пыталася ў сяброўкі школьніца за маёй спінай, калі галоўныя героі трапілі ў падземны лабірынт. Страху, магчыма, карціна і не нагнала, нават, належнага ўзроўню саспенсу не дасягнула, але дэтэктыўную дзіцячую гісторыю расказала «роўна». Новы беларускі дзіцячы фільм — жанр, дарэчы, для «Беларусьфільма» базавы — выбраў у якасці лакацый Нясвіжскі замак, абыграў таямніцу Радзівілаў і ў якасці знака сучаснасці прыплёў кіберспорт.

У выпадку з «Правіламі геймера» цікава назіраць, як на абсалютны дэтэктыўны шаблон апроч мясцовых патэрнаў нанізваюцца актуальныя рэаліі, якімі яны бачацца сцэнарысту Валянціну Залужнаму, Нацыянальнай кінастудыі і Міністэрству культуры, што выдзяляе сродкі на выбраныя праекты.

Фільм пачынаецца з каштоўнай і загадкавай знаходкі. Галоўныя героі — геймеры Дзімка, Юрка і Генка (у анатацыі яны называюцца менавіта такім панібрацкім спосабам) — выцягваюць з падзямелля адну з першых лічыльных машын і таямнічы медальён. Артэфакты павінны стаць ключом для пошуку клада Радзівілаў. Супрацоўнік музея бярэцца за даследаванне, але хутка трапляе ў бальніцу з-за рабаўнікоў, што прабраліся ў дом з надзеяй скрасці знаходку.

Справу даследчыка працягвае яго дачка Даша разам з геймерамі. Па законах жанру на спадчыну Радзівілаў прэтэндуе і банда, частка якой прасачылася ў штат музея, з дрэннымі намерамі і беспрынцыпнымі паводзінамі. Шлях да скарбу ў лабірынце знойдуць, канешне, менавіта дзеці, а зладзеі накіруюцца за імі і скарыстаюцца іх матэматычнымі здольнасцямі.

Выразнае раздзяленне на станоўчых і адмоўных герояў, здрадніцтва, шпіёнства, мудрагелісты тайнік са скарбам, дзе няправільная лічба павінна прывесці да непапраўных вынікаў, выратаванне ў апошні момант, выкрыццё «хто ёсць хто». А таксама героі, якія першапачаткова маюць карыслівую матывацыю, а ў выніку выяўляюць прыхільнасць сяброўству, высокім мэтам і праўдзе, ствараюць пэўны зразумелы і добра вядомы кінатрафарэт.

І сам факт выкарыстання шаблону, і яго напаўненне для кінастудыі з'яўляюцца сімптаматычнымі. «Правілы геймера», на жаль, выяўляюць даўнюю праблему не проста з якаснымі сцэнарыямі, а больш за тое — з арыгінальнасцю і хітрамудрасцю думак. Ужо трывала «Беларусьфільм» характарызуюць выкарыстанне гатовых формаў, некаторае перайманне і прага моцных эфектаў. «Правілы геймера» сталі чарговым доказам: фільм можна лічыць традыцыйным, добрым, лёгкім, разглядаючы яго, як адзінку кіно, але шаблонным, сімптаматычным і нецікавым у кантэксце кіно ўвогуле.

Тройка галоўных герояў захапляецца інтэрнэт-гульнямі, мае свой клуб і марыць пра ўдзел у турніры па кіберспорце. ІТ і без таго надзвычай папулярныя ў нашых фільмах і не толькі ў іх. Праўда, у гэтым выпадку жаданне зрабіць герояў цікавымі маленькім гледачам праз прапісанае захапленне кіберспортам выглядае даволі наіўным.



Анатоль БУТЭВІЧ прэзентуе чытачам «Звязды» сваю кнігу «Таямніцы Нясвіжскага замка».

■ Юбілей

ТО ЎЗАЕМНА!

Анатолю Бутэвічу — семдзесят. Юбіляр не дае сабе скідак на ўзрост і працуе не менш, чым раней: шчыруе на літаратурнай ніве, даследуе беларускую гісторыю, займаецца аховай гістарычных і культурных помнікаў. Яго аўтарытэт прызнаны ў розных галінах, а заўсёдная неабыякавасць, што прадвызначыла грамадскую дзейнасць, стала складнікам пажыццёва прысвоенага рангу Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла.

Але з досведам у кожнага фарміруецца ўласнае бачанне таго, што сапраўды каштоўнае: для Анатоля самай дарагой і нечаканай падзеяй застаецца прысваенне звання «Ганаровы грамадзянін горада Нясвіжа». Анатоль Бутэвіч нарадзіўся блізу гэтага старажытнага горада. Хоць ад маленькага хутара Язавец, дзе калісьці гаспадарылі яго бацькі і дзяды, не засталося нават следу, у кнігах Бутэвіча ёсць гісторыя гэтай зямлі. Уласна кнігі і надзялілі даследчыка грамадзянствам малой радзімы — Нясвіжскага краю.

Юбіляр, чыя дзейнасць выходзіць нават за межы Беларусі, — Анатоль Бутэвіч працуе ў складзе Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА, — апроч іншага, адзначаны ганаровым знакам Беларускага фонду культуры. Дзе значыцца: «Рупліўцу. Стваральніку».

Сябры, знаёмыя і аматары творчасці Анатоля Бутэвіча маюць падставу павіншаваць юбіляра словамі яго любімага героя Кастуся Каліноўскага: «Каго любіш? — Люблю Беларусь! — То ўзаемна!»

Яўген ПЯСЕЦКІ. Фота аўтара

У час міжнароднай экспедыцыі «Дарога да святыняў».

Са сваімі чытачамі на творчым вечары.

У Быхаве каля манументальнага знака «Баркулабаўскі летапіс».

■ Выстава

Ход канём

На новай выставе ў Нацыянальным мастацкім музеі — яна называецца «Equos. Koń. Конь» — можна ўбачыць больш за дзвесце твораў, дзе галоўным аб'ектам, цікавасцю і вобразам з'яўляецца, як ужо зразумела, конь. Экспазіцыя, што працуе з 15 чэрвеня, прадстаўляе жывапіс, скульптуру, графіку і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва з калекцый двух музеяў — самога прымальніка выставы і Музея Паўднёвага Падляшша ў Бялай Падлясцы. Урачыстае адкрыццё адбудзецца ў панядзелак 18 чэрвеня.

Экспазіцыя ўключае ў сябе творы беларускіх, рускіх і еўрапейскіх мастакоў з XVII да XXI стагоддзя і паказвае, у якім выглядзе, у якіх жанрах, на якім фоне і якім чынам аўтары розных часоў, мастацкіх школ і стыляў увасаблялі вобраз каня. Для лёгкасці ўспрымання выстава раздзелена на тэматычныя блокі, якія аб'ядноўваюць у сабе творы з падобнымі сюжэтамі.

«Equos. Koń. Конь» арганізавана пры падтрымцы пасольства Польшчы і Польскага інстытута ў Мінску і чарговы раз прэзентуе калекцыі Падляшша ў Беларусі. Нацыянальны мастацкі музей не ўпершыню супрацоўнічае з Музеем Паўднёвага Падляшша, у свой час у сумесных праектах удзельнічалі таксама Падляшскі музей у Беластоку і Акруговы музей у Сувалках.

У пэўным сэнсе выстава таксама прэзентуе калекцыю з Бялай Падляскі — з музея, які быў заснаваны ў 1924 годзе, але спыніў сваю дзейнасць з-за наступстваў Другой сусветнай вайны. Яго работа была адноўлена ў 1966 годзе, а збор сёння налічвае 2700 экспанатаў. Галоўнымі і найбольш каштоўнымі калекцыямі з'яўляюцца збор ікон XVII — пачатку XX стагоддзя беларускага, украінскага і рускага аўтарства, а таксама асобны збор «Кані, вершнікі, павозкі ў польскім мастацтве XIX—XX стст.», у якім захоўваюцца творы польскіх мастакоў.

Выстава «Equos. Koń. Конь» будзе працаваць у Нацыянальным мастацкім музеі да 26 жніўня.

Сафія ПАЛЯНСКАЯ

РЭЧЫ

Новая карціна «Беларусьфільма» не шукае складаных шляхоў

На фоне не вельмі вынаходлівага сцэнарыя выбар хобі герояў — відавочны аж да выкрыцця матываў аўтараў і звычайна нябачнай кінакухні. Пакаленне, зачараванае інтэрнэт-гульнямі, быццам павінна купіцца на фільм са словам «геймер» у назве, дзе само захапленне ўзведзена ў статус сур'ёзнай справы — з «правіламі гейміраў», аб'яднаннямі «прафесійных» гульцоў і турнірам па кіберспорце. То-бок чым адметныя героі? — звычайнымі жанравамі рэчамі накшталт вынаходлівасці, здольнасцямі ў пэўнай сферы (матэматыка) і некаторай авантурнасцю, а дадаткова — дзеля сучасных гледачоў — зацікаўленасцю анлайн-гульнямі.

Апошняя «рыса» тут даволі функцыянальная, бо тлумачыць матыў герояў увязвацца ў пошук скарбу (ім патрэбны грошы на ўдзел у турніры), а ў выніку адсоўваецца на другі план дзеля сяброў і вечных каштоўнасцяў. Апроч гэтага, кіберспорт, як і любое рашэнне сцэнарыста, тут нічога не значыць. «Правілы геймера» пабудаваны на функцыях, дзе задача зрабіць забаўляльнае кіно суправаджаецца задачай звязаць адзін эпізод з другім і больш ні пра што не клапаціцца.

Несумненнай вартасцю фільма з'яўляюцца нясвіжскія лакацыі: горад і замкавы комплекс пераўтварыліся ў цэлую загадкавую сетку таямніц, якая абыгрываецца праз адмысловае размяшчэнне аб'ектаў адносна адзін аднаго (накшталт «прамень сонца ў поўдзень пакажа шлях да партала...»), наяўнасць невядомых хадоў і лабірынтаў, адсылку да багацця славутага роду.

Горад, што хавае радзівілаўскую спадчыну, узбагаціўся цэлай інфраструктурай — тут ёсць тэлебачанне, што паведамляе пра сакрэтную групу жулікаў, якая наладзіла вываз каштоўнасцяў за мяжу; міліцыя са сваім грунтоўным следствам і шпіёнам у варожым лагеры; музей са штатам супрацоўнікаў — сур'ёзных даследчыкаў. Карацей, правінцыйны беларускі горад атрымаў усе складнікі дэтэктыва і жыццё ў ім падпарадкавалася законам кіно.

Несвіжскія рэсурсы і таямніца Радзівілаў — таксама даволі відавочны выбар. Гэта прыемна — бачыць у кіно адсылку да слаўных старонак беларускай гісторыі і не першыя, але спробы іх абыграць, пабудаваць на іх сучаснае мастацтва, выкарыстаць іх добрую славу для свайго сюжэта. Але выбар зноў жа выдатна падпарадкоўваецца логіцы стваральнікаў «Правілаў геймера». Дзе лепш за ўсё схаваць скарб? — у замку, то-бок у першую чаргу ў Міры альбо Нясвіжы. Што за скарб павінен там хавацца? — канешне ж, звязаны з Радзівіламі. Пры гэтым Радзівілы служаць карціне зноў жа толькі функцыянальна, — калі забаўляльнаму сюжэту не хапае інтрыгі і таямнічасці, трэба выкарыстаць знакамітае імя.

Адным словам, «Беларусьфільм» не шукае складаных шляхоў — у выкарыстанні кінашаблонаў у пэўнай канфігурацыі і іх напаўненні кінастудыя выяўляе сваю бездапаможнасць. Ва ўсім свеце межы паміж дзіцячым і дарослым кіно размываюцца, а кантэнт, прызначаны ў тым ліку для юнай аўдыторыі, размаўляе на сур'ёзныя тэмы без спрошчанага сюсюкання. У гэты час беларускі дзіцячы фільм спрабуе трансляваць старыя ўстаноўкі, прычым у максімальна даступнай манеры: трэба дапамагаць маці, добра вучыцца, выручаць сяброў, не здраджваць, быць справядлівым і так далей.

Тым не менш гісторыя атрымала належнае візуальнае ўвасабленне. Нягледзячы на такі з пэўнага пункту гледжання няўдалы сцэнарый, рэжысёр Ігар Чацверыкоў зняў добрую карціну. Зноў жа «выканаў сваю функцыю», як і шмат што ў «Правілах геймера» гэтым займаецца і, дарэчы, абмяжоўваецца.

Нацыянальная кінастудыя зноў выявіла занадта шмат інфармацыі пра стан сваіх спраў праз аддадзены ў пракат фільм.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ

ЗАО «Белреализация» объявляет о проведении торгов

Публичные торги в электронной форме по продаже имущества в исполнительном производстве будут проведены: **11 июля 2018 г. начало 09.00, окончание 18.00** на электронной торговой площадке WWW.BELTORGI.BY. Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27. тел.: (8017) 298-53-53, +375 29 690-54-09, e-mail: marketing@zalog.by. Телефон для ознакомления и осмотра лотов +375 29 698-53-03.

Наименование лота	Начальная цена, бел. руб.	Местонахождение	Собственник
Автобетоносмеситель «КАМАЗ 651162 58147», 2010 г. в.	12 100,00	г. Гомель, Индустриальный проезд, 12	ООО «Строительная компания «СНД»
Автобетоносмеситель «КАМАЗ 65115 62581447Z», 2008 г. в.	7 800,00		

Для участия в торгах необходимо: 1) **в срок по 10 июля 2018 г. 16.00** перечислить задаток по выбранному лоту в размере 10 % от начальной стоимости лота; 2) подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте WWW.BELTORGI.BY. Величина первого шага торгов составляет 5 % начальной стоимости лота. Победителем торгов признается участник торгов, предложивший наибольшую цену за лот. Победитель торгов (покупатель) обязан возместить затраты на организацию и проведение торгов. Подробнее на WWW.BELTORGI.BY.

ИЗВЕЩЕНИЕ

Коммунальное унитарное дочернее предприятие «Управление капитального строительства Запад» доводит до сведения заинтересованных лиц о внесении изменений в проектную декларацию о строительстве жилых помещений, объекта «Реконструкция застройки территории в районе ул. Михалово, Алибегова.» Жилой дом № 12 по генплану», опубликованной в газете «Звязда» № 200 (28564) от 17.10.2017.

Предполагаемый срок ввода жилого дома в эксплуатацию – 30 сентября 2018 года.

УНП 192400611

Уведомление

об общественном обсуждении отчета об оценке воздействия на окружающую среду по отчету: 17.055 «Реконструкция с реставрацией здания неустановленного назначения (дом-усадьба «Белая Дача») по ул. Казинца, 54 под культурно-просветительский центр (стадия пп)

Заказчик планируемой деятельности: ООО «СильверКапитал».

Юридический адрес: Республика Беларусь, 220040, г. Минск, ул. М. Богдановича, д.118, пом. 17Н, офис 315.

Почтовый адрес: Республика Беларусь, 220040, г. Минск, ул. М. Богдановича, д.118, пом. 17Н, офис 315.

Номер телефона: +375 17 343 20 41; номер факса +275 17 343 20 42.

Контактное лицо: Главный инженер ООО «СильверКапитал»: Воронов Олег Михайлович +375 29 679 143 74.

Наименование планируемой деятельности: «Реконструкция с реставрацией здания неустановленно назначения дом-усадьба «Белая дача» по ул. Казинца, 54 под культурно-просветительский центр.

Цели планируемой деятельности: реконструкция с реставрацией здания неустановленно назначения дом-усадьба «Белая дача» по ул. Казинца, 54 под культурно-просветительский центр.

Обоснование планируемой деятельности: решение Мингорисполкома № 2367 от 13 июля 2017 «О разрешении ООО «СильверКапитал» проведения проектно-изыскательских работ «Реконструкцию и реставрацию здания (Дом-усадьба «Белая дача»)».

Описание планируемой деятельности: реконструкция с реставрацией здания (дом-усадьба «Белая дача») по ул. Казинца, 54 под культурно-просветительский центр, с максимальным восстановлением облика здания 1913 года.

Место размещения планируемой деятельности: реконструкция здания будет осуществляться в Октябрьском районе г. Минска по ул. Казинца, 54. Планируемый объект находится в 159 ЛР зоне ландшафтно-рекреационных территорий г. Минска и граничит с северо-восточной стороны с ботаническим памятником природы местного значения «Дубово-липовый массив «Белая дача». С южной стороны участок граничит с административными зданиями. В северо-восточной части расположено водохранилище Лошица.

Сроки осуществления планируемой деятельности: реализация проекта 2018–2019 год.

Орган, принимающий решение о разрешении строительства: Минский городской исполнительный комитет, почтовый адрес: 220030, г. Минск, пр-т Независимости, 8. Горячая линия: 328-55-66, e-mail: mgik@minsk.gov.by, интернет-сайт: www.minsk.gov.by

УНП 192715361

Извещение о проведении аукциона по передаче земельного участка в частную собственность

организатор аукциона – Березинский районный исполнительный комитет

лот №	Местоположение земельного участка, кадастровый номер	Площадь земельного участка, га	Назначение земельного участка	Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона	Начальная цена земельного участка, бел.руб.	Сумма задатка, бел. руб
1	Минская область, г. Березино, ул. Набережная, 22 620450100001002610	0,0793	Для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома)	– внесение платы (части платы – в случае предоставления в установленном порядке рассрочки ее внесения) за земельный участок; – **возмещение затрат**: расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ будут определены на основании счета-фактуры; – осуществлением победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона в двухмесячный срок государственной регистрации права на земельный участок; – получения победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона в течении одного месяца после осуществления государственной регистрации права на земельный участок разрешения на проведение проектно-изыскательских работ для строительства; – занятия земельного участка не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство данного объекта	5333,45	533,34

1. **Аукцион состоится 17 июля 2018 года в 14.00 в малом зале заседаний Березинского райисполкома по адресу: г. Березино, ул. Октябрьская, 18.**

2. **Заявления** на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **принимаются** ежедневно в рабочие дни по адресу: г. Березино, ул. Октябрьская, 39, отделом землеустройства Березинского РИК с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, **до 16.00 12.07.2018 года.** Также для участия в аукционе необходимо представить документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка, а также заключить с Березинским райисполкомом или по его поручению с организацией соглашение.

3. Кроме того, в комиссию или организацию представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

При подаче документов на участие в аукционе граждане, предъявляют документ, удостоверяющий личность.

4. **Сумма задатка перечисляется на р/с BY88AKBB36006110002020000000, ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, AKBBBY2X, получатель – ГУ МФ РБ по Минской обл., код платежа – 04901.**

5. Аукцион признается несостоявшимся или нерезультативным, если заявления на участие в нем подано только одним участником, или для участия в аукционе не было подано ни одного заявления, или на аукцион явился один из участников, или ни один из участников не явился на аукцион. Не допускаются начало торгов и продажа предмета аукциона по начальной цене.

6. Победитель аукциона должен подписать протокол в день проведения аукциона. Внесение платы за предмет аукциона осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения местным исполнительным комитетом решения о предоставлении победителю аукциона земельного участка.

7. Шаг аукциона – 5 процентов от предыдущей цены, называемой аукционистом.

8. В случае если победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) не подписал протокол о результатах аукциона, не уплатил сумму, по которой продан предмет аукциона, не возместил затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, а также в случае если участники аукциона отказались объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным, указанными лицами уплачивается штраф в размере 100 базовых величин, внесенный ими задаток не возмещается.

Дополнительную информацию можно получить по тел.: 8 (01715) 5-57-71, 5-56-39

УНП 600041227

Извещение о проведении аукциона по передаче земельного участка в частную собственность

организатор аукциона – Березинский районный исполнительный комитет

лот №	Местоположение земельного участка, кадастровый номер	Площадь земельного участка, га	Назначение земельного участка	Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона	Начальная цена земельного участка, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб
1	Минская область, г. Березино, ул. Северная, 4 620450100001003475	0,1500	Для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома)	– внесение платы (части платы – в случае предоставления в установленном порядке рассрочки ее внесения) за земельный участок; – **возмещение затрат**: расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ будут определены на основании счета-фактуры; – осуществлением победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона в двухмесячный срок государственной регистрации права на земельный участок; – получения победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона в течении одного месяца после осуществления государственной регистрации права на земельный участок разрешения на проведение проектно-изыскательских работ для строительства; – занятия земельного участка не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство данного объекта	5390,67	539,06

1. **Аукцион состоится 17 июля 2018 года в 14.00 в малом зале заседаний Березинского райисполкома по адресу: г. Березино, ул. Октябрьская, 18.**

2. **Заявления** на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **принимаются** ежедневно в рабочие дни по адресу: г. Березино, ул. Октябрьская, 39, отделом землеустройства Березинского РИК с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, **до 16.00 12.07.2018 года.** Также для участия в аукционе необходимо представить документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка, а также заключить с Березинским райисполкомом или по его поручению с организацией соглашение.

3. Кроме того, в комиссию или организацию представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

При подаче документов на участие в аукционе граждане, предъявляют документ, удостоверяющий личность.

4. **Сумма задатка перечисляется на р/с BY88AKBB36006110002020000000, ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, AKBBBY2X, получатель – ГУ МФ РБ по Минской обл., код платежа – 04901.**

5. Аукцион признается несостоявшимся или нерезультативным, если заявления на участие в нем подано только одним участником, или для участия в аукционе не было подано ни одного заявления, или на аукцион явился один из участников, или ни один из участников не явился на аукцион. Не допускаются начало торгов и продажа предмета аукциона по начальной цене.

6. Победитель аукциона должен подписать протокол в день проведения аукциона. Внесение платы за предмет аукциона осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения местным исполнительным комитетом решения о предоставлении победителю аукциона земельного участка.

7. Шаг аукциона – 5 процентов от предыдущей цены, называемой аукционистом.

8. В случае если победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) не подписал протокол о результатах аукциона, не уплатил сумму, по которой продан предмет аукциона, не возместил затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, а также в случае если участники аукциона отказались объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным, указанными лицами уплачивается штраф в размере 100 базовых величин, внесенный ими задаток не возмещается.

Дополнительную информацию можно получить по тел.: 8 (01715) 5-57-71, 5-56-39

УНП 600041227

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Лот 1: капитальное строение, инв. № 420/С-60716 (назначение – здание специализированное для бытового обслуживания населения, наименование – здание комплексного приемного пункта по обслуживанию сельского населения) площадью 62,7 кв. м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Круповский с/с, а. г. Гуды, ул. Центральная, 33.

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 423684304649000114, (назначение – для обслуживания здания комплексно-приемного пункта по обслуживанию сельского населения) площадью 0,0892 га, расположенном по адресу: Лидский р-н, Круповский с/с, а. г. Гуды, ул. Центральная, 33. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, расположенный в охранных линиях связи и радиофикации, код – 13,1, площадью 0,0047 га; земельный участок, расположенный в охранной зоне линий электропередачи, код – 13,2, площадью 0,0089 га; земельный участок, расположенный в охранной зоне сетей и сооружений газоснабжения, код – 13,7, площадью 0,0028 га

Начальная цена продажи – 6 600 руб. (шесть тысяч шестьсот рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 660 руб. (шестьсот шестьдесят рублей)

Лот 2:

– капитальное строение, инв. № 420/С-58980 (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – гараж) площадью 35,8 кв. м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Ходоровский с/с, а.г. Голдово, ул. Советская, 6/1.

– капитальное строение, инв. № 420/С-58981 (назначение – здание специализированное для бытового обслуживания населения, наименование – здание комплексного приемного пункта по обслуживанию сельского населения) площадью 56,8 кв. м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Ходоровский с/с, а. г. Голдово, ул. Советская, 6.

Лот № 2 расположен на земельном участке, кадастровый номер 423686501873000128, (назначение – для обслуживания здания комплексно-приемного пункта по обслуживанию сельского населения (для размещения объектов бытового обслуживания населения)), площадью 0,0671 га, расположенном по адресу: Лидский р-н, Ходоровский с/с, а. г. Голдово, ул. Советская, 6. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, находящийся в зоне санитарной охраны водного объекта, используемого для питьевого водоснабжения, код – 4,3, площадью 0,0671 га.

Обременения со стороны 3-х лиц: в виде аренды сроком до 11.10.2018 г.

